# Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту – 90!

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

24 кастрычніка 2011 года, № 16 (2054)

## З юбілеем, альма-матар!

**Дарагія сябры! Віншую шматтысячны калектыў комплексу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта з 90-годдзем з дня заснавання БДУ!**



***30 кастрычніка 1921 г.*** – дзень нараджэння нашага ўніверсітэта – важная дата не толькі для ўсёй супольнасці БДУ, але і для краіны! Разам з рэспублікай Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт ствараўся, рос, развіваўся, «мужнеў» і ўсе гады сапраўды з'яўляўся флагманам нацыянальнай вышэйшай школы!

Нам ёсць чым ганарыцца: у БДУ падрыхтавана каля 150 тыс. спецыялістаў, у тым ліку больш за 7 тыс. для замежных дзяржаў. Сярод выхаванцаў ВНУ – мноства людзей, чыімі імёнамі ганарыцца наша краіна. За выбітныя дасягненні ў навуцы і тэхніцы больш за 135 супрацоўнікаў БДУ ў розныя гады заахвочаны дзяржаўнымі прэміямі, 68 выпускнікоў універсітэта сёння з'яўляюцца дзейнымі акадэмікамі і членамі-карэспандэнтамі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. У самім комплексе БДУ цяпер разам са знешнімі сумяшчальнікамі працуюць 14 акадэмікаў і 16 членаў-карэспандэнтаў НАН Беларусі.

***БДУ сёння – гэта 25 факультэтаў і інстытутаў, ліцэй і каледж, у якіх навучаецца 35,5 тыс. грамадзян.*** Ажыццяўляецца падрыхтоўка спецыялістаў па 58 спецыяльнасцях на першай ступені вышэйшай адукацыі, па 48 спецыяльнасцях – на другой (магістратура), па 113 спецыяльнасцях у аспірантуры і па 29 спецыяльнасцях у дактарантуры. У складзе ўніверсітэта: 4 навукова-даследчыя інстытуты, 9 навуковых цэнтраў, 41 навуковая лабараторыя, 11 інавацыйных і вытворчых прадпрыемстваў.

Напружаная праца калектыву ўніверсітэта дазволіла ўмацаваць яго пазіцыі ў сусветнай адукацыйнай прасторы! Так, у рэйтынгу брытанскага агенцтва QS (THE - QS World University Rankings), які праводзіцца штогод, БДУ ўпершыню ўвайшоў у ТОП-700 найлепшых універсітэтаў свету і знаходзіцца ў групе ВНУ, якія займаюць 501–550 пазіцыі, а ў міжнародным рэйтынгу Webometrics БДУ падняўся адразу на 268 пазіцый!

Мы любім наш універсітэт і ганарымся ім! І хоць 90 гадоў – сур'ёзны і высакародны ўзрост, я ўпэўнены, што для БДУ гэта толькі першая палова шляху, і наперадзе новыя поспехі, новыя перамогі!

Слава БДУ ў яго выхаванцах і настаўніках, у яго навукоўцах і працаўніках!

Мы памятаем усіх, хто тварыў гісторыю alma mater, мы шануем сённяшніх творцаў і спадзяёмся на таленавітых паслядоўнікаў!

Віват БДУ! Віват наша слаўная ўніверсітэцкая супольнасць!

*Рэктар, акадэмік*

***Сяргей АБЛАМЕЙКА***

## ГІСТОРЫЯ БДУ – ГІСТОРЫЯ КРАІНЫ

• ***Адкрыццё БДУ адбылося 30 кастрычніка 1921 года ў складзе 3 факультэтаў:*** *рабочага, грамадскіх навук і медыцынскага. У першым навучальным годзе ўсяго навучаліся 1124 студэнты і працавалі 49 выкладчыкаў (14 прафесараў, 25 дацэнтаў і 10 асістэнтаў). Многія з іх прыехалі для працы ў БДУ з універсітэтаў Расіі, Украіны і Польшчы, маючы ўжо на той час сусветнае прызнанне сярод навуковай грамадскасці. Першым рэктарам БДУ стаў выбітны гісторык-славіст Уладзімір Пічэта.*

• *У 20-я гады актыўна ішоў працэс арганізацыі ўсёй навуковай і адукацыйнай сістэмы краіны.* ***За 10 гадоў свайго існавання Белдзяржуніверсітэт стаў базай для стварэння 12 ВНУ і шэрагу НДІ.***

• *Напярэдадні 20-гадовага юбілею БДУ складаўся з 6 факультэтаў і 33 кафедраў, на якіх працавалі 17 прафесараў, 41 дацэнт, больш за 90 выкладчыкаў і асістэнтаў. На ўсіх факультэтах навучаліся 1337 студэнтаў. У 1941 г. дзейнасць універсітэта была перапынена вайной і аднавілася ў 1943 г. на станцыі Сходня пад Масквой. Вялікую дапамогу беларускай ВНУ ў гэты перыяд аказаў МДУ імя М. Ламаносава і іншыя вышэйшыя навучальныя ўстановы.*

• *Даваенная вучэбна-навуковая і вытворчая база ўніверсітэта ў асноўным аднавілася да 1950 г.* ***У 1957 г.*** *рэктарам універсітэта стаў выдатны вучоны-фізік Антон Нічыпаравіч Сеўчанка, з імем якога звязана цэлая эпоха грандыёзных пераўтварэнняў у гісторыі БДУ.*

• ***У межах СССР універсітэт уяўляў сабой найбуйнейшы навукова-адукацыйны цэнтр.*** *БДУ быў адзначаны высокімі ўрадавымі ўзнагародамі – ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1967), ганаровымі граматамі і інш.*

• *Пры падтрымцы дзяржавы з другой паловы 1990-х гг. БДУ значна ўмацаваў сваю матэрыяльна-тэхнічную базу, абнавіў асноўныя фонды, правёў рэарганізацыю вучэбна-адукацыйнага працэсу і навуковай сферы, стварыў развітую інфраструктуру.*



Фота РЫФТУР

# У БДУ ЁСЦЬ ПАТЭНЦЫЯЛ, КАБ

***Вось і падышоў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт да паважнага рубяжа – свайго 90-годдзя. Да гэтай значнай падзеі ўніверсітэцкая супольнасць рыхтавалася даўно. І не дзіўна, бо такая дата абавязвае да многага. За плячыма – агромністая гісторыя і каласальны багаж, шмат падзей і перыпетый, якія патрабуюць асэнсавання. З універсітэтам звязаны тысячы чалавечых лёсаў і мноства дасягненняў. Ад лістапада 2008 г. БДУ ўзначальвае акадэмік Сяргей АБЛАМЕЙКА, і за гэты час універсітэт прайшоў цікавы шлях, адбылося шмат нававядзенняў. Мы пагутарылі з рэктарам пра мінулае, сучаснасць і будучыню вядучай ВНУ краіны.***

## ПАД ЗНАКАМ ЮБІЛЕЮ

***– Сяргей Уладзіміравіч, якія пачуцці перапаўняюць рэктара напярэдадні свята?***

– Зразумела, заўжды падыходзіш да юбілею з хваляваннем, бо мусіш прыняць гасцей, а іх да нас прыедзе шмат – і беларусаў, і замежнікаў, трэба добра правесці свята – адчуваеш адказнасць гаспадара. Таму і збіраемся зараз кожныя 3–4 дні: супрацоўнікі, ветэраны, студэнты... Праграма святкавання надзвычай насычаная, і мы ўжо год рыхтуемся: выдаём кнігі, распрацоўваем і напаўняем сайты, праводзім канферэнцыі і шмат чаго яшчэ, каб годна сустрэць юбілей. Але адчувальнае таксама і задавальненне, бо ўніверсітэт сустракае 90-годдзе ў добрым стане: мы дынамічна развіваемся, маем добрыя адукацыйныя, навуковыя, вытворчыя вынікі, шмат чаго зроблена, і мы з кожным годам умацоўваем свае пазіцыі.

***– Што ў пройдзены перыяд жыцця ўніверсітэта ўдалося найлепш, а што, можа, і не надта атрымалася?***

– З самых заўважных падзей універсітэцкага жыцця за апошнія 10 гадоў магу назваць увядзенне корпуса юрыдычнага факультэта, новых студэнцкіх інтэрнатаў, цудоўнага будынка на Кальварыйскай, нашага спартыўнага комплексу на Кастрычніцкай; вось, спадзяюся, і корпус ФМА неўзабаве можна будзе залічыць да нашых поспехаў. І гэта толькі буйныя аб'екты будаўніцтва. Калі ж гаварыць пра матэрыяльна-тэхнічную базу, дык нельга абмінуць камп'ютарызацыю – і камп'ютарны парк абнавілі, і медыятэкі адкрылі, і доступ да інтэрнэту студэнтам забяспечылі, у тым ліку ў інтэрнатах, прытым пашыраем канал і з 2011 года адкрываем кропкі бесправаднога доступу, паўтара года таму нарадзіўся суперкамп'ютарны цэнтр, цяпер рыхтуемся зрабіць яго магутнейшым... Крызіс, вядома, паўплываў на нашы планы закупкі камп'ютарнай тэхнікі...

Але галоўнае – гэта нашы студэнты. І дынаміка прыёму ў БДУ, конкурсу збольшага радуе: ахвотных вучыцца ў нас пастаянна больш, чым маем месцаў, прытым насуперак дэмаграфічнаму спаду. Колькасць студэнтаў у нас вырасла за гэта дзесяцігоддзе больш, чым на траціну. Клапоціць толькі пэўнае зніжэнне абсалютнай паспяховасці і занадта высокі працэнт адлічэнняў студэнтаў.

## ПАСПЯХОВАЯ КАМПАНІЯ

***– Дарэчы, пра згаданыя Вамі вынікі прыёмных кампаній: як мяркуеце, чым абумоўлены надзвычай паспяховы набор гэтага года?***

– Мяркую, нашай напружанай працай. Штогод мы аналізуем вынікі прыёмнай кампаніі, і вось летась прыродазнаўчыя спецыяльнасці далі нам нагоду турбавацца, так што ўсе факультэты правялі моцную, нават агрэсіўную прафарыентацыйную працу, ды і на ўзроўні ўніверсітэта таксама – ладзілі ўсемагчымыя выезды, фестываль факультэтаў, удзельнічалі ў выставах. Новыя спецыяльнасці цудоўна стрэлілі: у 2011/2012 навуч. г. адкрыты 3 новыя спецыяльнасці вышэйшай адукацыі (біяхімія, мікрабіялогія, кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі) і 8 новых напрамкаў спецыяльнасцяў. І мы атрымалі выдатны вынік – прыродазнаўчыя факультэты, вельмі важныя для краіны (маю на ўвазе мехмат, ФПМІ, радыёфізікаў, фізікаў), узялі студэнтаў і больш, і лепшых. Думаю, па наборы мы дайшлі да мяжы сваіх магчымасцяў (па комплексе БДУ сёлета навучаецца 35,5 тысяч грамадзян – *Рэд.*), у бліжэйшыя пяць гадоў павялічваць колькасць студэнтаў не плануем. Цяпер яшчэ больш увагі нададзім якасці – вось і сістэма менеджменту якасці адукацыі ўкаранёная.

***– На вучоным савеце Вы адзначылі, што неспрыяльная дэмаграфічная сітуацыя захаваецца яшчэ некалькі гадоў. Якія захады запланаваны, каб утрымаць заяўленую аптымальную колькасць студэнтаў?***

– Тут насамрэч цэлы комплекс захадаў: і вучэбная, і навуковая праца, і сацыяльна-культурнае і спартыўнае жыццё студэнтаў. Мы працуем, каб павысіць прэстыжнасць вучобы ў БДУ, каб абітурыенты ведалі, якая выгадная праца іх чакае па выпуску (бо па размеркаванні нашых выпускнікоў з ахвотай бяруць найлепшыя працадаўцы). Маем, на жаль, праблему з інтэрнатамі – забяспечанасць імі студэнтаў зараз складае каля 50%, гэта нас моцна стрымлівае, у тым ліку і ў працы з замежнікамі, дзе ў БДУ ёсць вялікі патэнцыял. Так што вельмі спадзяёмся на інтэрнат у Студэнцкай вёсцы і чакаем адрамантаваную «тройку». Ну і, зразумела, працягнем уводзіць новыя спецыяльнасці і паляпшаць узровень навучальнага працэсу.

## РЭФАРМАТАРСКІ ІМПЭТ

***– Ці плануецца «асучасніць» факультэты, апрача новых будынкаў і абсталявання?***

– Няпростае пытанне. Мы над гэтым працуем. За мінулы навучальны год былі рэарганізаваны 22 кафедры і створаны 2 новыя. Стварэнне, перапрафіляванне, мадэрнізацыя кафедраў – такая праца вядзецца пастаянна, а вось на факультэцкім узроўні складаней. Апошнія створаныя ў БДУ факультэты – гуманітарны, якому да сёння падбіраем новую назву, і факультэт перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі ў Інстытуце журналістыкі. Таксама аднаўленне факультэта даўніверсітэцкай адукацыі варта згадаць. Надоечы, як вы ведаеце, атрымаў новую назву факультэт радыёфізікі. Пэўны кансерватызм, лічу, павінен быць у класічным універсітэце, гэта правільна: каб філасофія была філасофіяй, хімія – хіміяй. Але трэба шукаць баланс з дынамікай і развіццём, а ў нас пакуль пераважае кансерватызм, і я як рэктар гэтым не вельмі задаволены. Будзем працаваць, каб не адставаць ад універсітэтаў іншых краін. Нам трэба смялей ставіцца да новых формаў працы.



***– Згадайце, калі ласка, найбольш важныя тэндэнцыі за апошні час.***

– Апошні год атрымаўся насычаны, цікавы і важны: тут і падрыхтоўка да юбілею, і значная сацыяльна-палітычная падзея – прэзідэнцкія выбары, да чаго ў БДУ падышлі з усёй адказнасцю, і мяжа пяцігодак, калі падводзяцца вынікі, прымаецца новая Праграма перспектыўнага развіцця ўніверсітэта. У снежаньскай справаздачы я з гонарам агучваў на вучоным савеце лічбы, датычныя паспяховага развіцця БДУ, бо ўсе нашы паказчыкі – дынамічнай і магутнай арганізацыі.

За апошнія гады БДУ стаў яшчэ мацней. Колькасць навучэнцаў у 2009–2011 гг. павялічылася на 5 тыс. чалавек. Даходы комплексу БДУ з 2008 г. выраслі ў 1,6 раза. Больш чым у 2 разы вырас экспарт навукова-тэхнічнай прадукцыі і адукацыйных паслуг. Бюджэт універсітэта ў 2011 г. складзе 484 млрд рублёў і значна перавышае бюджэты ўсіх астатніх ВНУ. Нароўні з гэтым радуе, што колькасць работнікаў адміністрацыйна-абслуговага, вучэбна-дапаможнага і іншага персаналу, які ўтрымліваецца за дзяржаўныя сродкі, штогод памяншаецца і ў 2011 г. на 10 % ніжэйшая ў параўнанні з 2008 г.

***– Ці атрымалася пераламіць сітуацыю са старэннем кадраў?***

– Кардынальных зрухаў тут не адбылося, але ж 2010 год, напрыклад, у нас выдаўся вельмі плённым у абаронах доктарскіх дысертацый. Такіх набралася 9 (найлепшы вынік за апошнія пяць гадоў). Маладых «аступененых» кадраў па-ранейшаму не хапае, ідзём тут на сярэднерэспубліканскім узроўні, чаго нам, натуральна, мала: выкладчыкі да 30 год складаюць каля 18 % ПВС, а хацелася б больш за 20 %. Вось прызначылі маладога дырэктара Ліцэя БДУ (В. Матуліс), Інстытутам бесперапыннай адукацыі цяпер кіруе малады доктар навук (С. Сабалеўскі) – гэта добрыя крокі, але пакуль невялікія. Таму задзейнічаем усё магчымае матэрыяльнае стымуляванне, 113-кватэрны дом нядаўна пабудавалі для выкладчыкаў, па вельмі невысокім кошце, і гэта вялікая падтрымка для маладых спецыялістаў.

***– Ва ўніверсітэце распачатая праца па стварэнні міждысцыплінарных адукацыйных цэнтраў...***

– Гэта ў цэлым вельмі важны кірунак для краіны і яе навукі. У гэтай сферы працуюць розныя факультэты, інстытуты, у першую чаргу хімфак і фізфак, НДІ фізіка-хімічных праблем, НДІ ядзерных праблем, інфарматыкаў трэба дадаць. Мы хочам аб'яднаць розных спецыялістаў, каб стварыць навукова-практычныя цэнтры на аснове інтэграцыі навукова-педагагічнага патэнцыялу падраздзяленняў універсітэта. Цяпер рушым да стварэння падобнага цэнтра па нанатэхналогіях і нанаматэрыялах на базе НДІ ядзерных праблем – выпрацоўваецца нарматыўная база, каб, не разбурыўшы наяўныя структуры, стварыць нешта новае. Таксама ў верасні ў БДУ ўжо адкрыты міжкафедральны цэнтр – кафедры ЮНЕСКА па прыродазнаўчай адукацыі.

## НА ГІСТАРЫЧНЫМ БАЗІСЕ

***– Якое месца ўвогуле займае БДУ ў жыцці краіны?***

– БДУ заўжды істотна ўплываў на жыццё краіны: у 1920–30-я гады і пазней з яго «адпачкоўваліся» акадэмічныя інстытуты і цэлыя ВНУ, тут выхоўваліся першыя пакаленні нацыянальнай інтэлігенцыі. Уплыў БДУ адчувальны на адукацыйных, навуковых, культурных, нават заканадаўчых працэсах краіны, на духоўным развіцці грамадства. Адзначым і ўплыў універсітэта на фарміраванне міжнароднага іміджу краіны, асабліва важны для незалежнай Беларусі. Унёсак БДУ ў станаўленне суверэнітэту краіны сапраўды вялікі: гэта і фарміраванне заканадаўчай базы, і міжнародныя зносіны, і навуковы патэнцыял. Навукоўцы БДУ бралі ўдзел у распрацоўцы Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, нашы выпускнікі ўзначальваюць Канстытуцыйны, Вярхоўны і іншыя вышэйшыя суды, міністэрствы інфармацыі і культуры, фарміруюць урадавую палітыку, кіруюць многімі ВНУ, большасць супрацоўнікаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі з'яўляюцца выхадцамі з БДУ. Універсітэт сапраўды вельмі шмат зрабіў для краіны, і ў савецкі час, і асабліва ў апошнія 20 гадоў.

***– Якім, мяркуеце, прыйдзе БДУ да свайго стагоддзя?***

– Гэта будзе найбуйнейшы вучэбна-навукова-культурны цэнтр краіны. Тут будуць



Фота РЫФТУР

# СТАЦЬ ЯШЧЭ МАЦНЕЙШЫМ

праводзіцца асноўныя фундаментальныя даследаванні. Мяркуем значна павялічыць унёсак БДУ ў сусветную адукацыйную і навуковую прастору. У 2009 г. БДУ стаў членам Еўрапейскай асацыяцыі ўніверсітэтаў, ён заснавальнік Еўразійскай асацыяцыі ўніверсітэтаў, каардынатар ад Рэспублікі Беларусь ва Універсітэцкай сетцы Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывы, спрыяе дзейнасці Беларускай асацыяцыі садзейнічання ААН, Міжуніверсітэцкага цэнтра даследаванняў і супрацоўніцтва ва Усходняй і Паўднёва-Усходняй Еўропе. Таксама і праз удзел у згаданых структурах аўтарытэт БДУ расце. Мы ўжо цяпер змагаемся за добрыя месцы ў сусветных рэйтынгах. А імкнёмся да стагоддзя ўвайсці ў сотню найлепшых ВНУ свету, распрацаваны адпаведныя праграмы – так што ў нас цудоўныя перспектывы. Канешне, вялікія спадзяванні мы ўскладваем і на рамонт галоўнага корпуса БДУ – нашага ўніверсітэцкага асяродка. У хуткім часе мы пачнём рэалізацыю гэтай маштабнай задачы. Да свайго стогадовага юбілею БДУ мусіць падысці ў найлепшым выглядзе.

***– Дарэчы, за мінулы год БДУ ўдалося істотна ўмацаваць пазіцыі ў сусветнай адукацыйнай прасторы. Так, у рэйтынгу брытанскага агенцтва QS БДУ знаходзіцца ў групе ВНУ, якія займаюць 501–550 пазіцыі. У міжнародным рэйтынгу Webometrics БДУ падняўся на 1208 пазіцыю. Якім чынам здолелі ажыццявіць гэты прарыў?***

– Як і кожны прарыў, гэты быў падрыхтаваны карпатлівай і мэтаскіраванай працай. У нас існуе вялікая працоўная група, якая аналізуе крытэрыі рэйтынгаў, высвятляе, што трэба зрабіць БДУ. Але гэта не адмяняе навуковай і адукацыйнай працы: адна справа – выкласці ў інтэрнэце, іншая – каб было што выкладваць. Артыкулы навукоўцаў універсітэта, выступленні, канферэнцыі, міжнародныя праграмы – усё гэта ўплывае на рэйтынгі. Заўважу, што па паказчыку «навуковыя публікацыі» ўніверсітэт знаходзіцца на 529-м месцы ў свеце. Мы пачалі паступальны рух наверх. Працуем з дэканамі, каб нагадваць нашым навукоўцам, што трэба не толькі публікавацца, але ж і рэкламаваць сваю дзейнасць, паказваць, прапагандаваць – высілкі кожнага дапамогуць палепшыць рэйтынгі. Вельмі спрыяе «прасоўванню» БДУ створаны ў 2009 г. новы сайт універсітэта (з абноўленай версіяй у 2011 г.), які выконвае ролю цэнтральнага партала, што забяспечвае доступ да ўсіх інфармацыйных рэсурсаў БДУ. Плануем у новым корпусе ФМА разгарнуць выставу навукова-тэхнічных дасягненняў БДУ – паказваць сябе на добрым сучасным узроўні. Гэта таксама дасць плён.

## БУДЫЧЫНЯ ЗА ІНФАРМАТЫЗАЦЫЯЙ

***– Нядаўна ў ліцэі БДУ пачалася рэалізацыя цікавага праекта: навучанне моладзі з дапамогай планшэтаў. Як рэагуюць ліцэісты на гэтыя новаўвядзенні, і што самі пра яго думаеце?***

– Гэта вельмі правільны рух, і я рады, што БДУ яго пачаў. Моладзь з камп'ютарам, як кажуць, на «ты». Назіраем сусветны рух ад папяровых носьбітаў да электронных. Студэнты з электроннай інфармацыяй ужо працуюць даволі ўмела – цяпер трэнд ахоплівае і школы. Наш эксперымент такі: падарылі кожнаму вучню хіміка-біялагічнага класа рыдары, напоўненыя падручнікамі, электроннымі перакладчыкамі, мастацкай літаратурай і падобнай карыснай для навучання інфармацыяй, каб вучні з ёй працавалі пастаянна – і хатнія заданні рабілі з дапамогай рыдараў, і кантрольныя выконвалі... Канешне, у любога медаля ёсць два бакі, і мы будзем пільна адсочваць, каб не нашкодзіць здароўю школьнікаў, каб у іх, напрыклад, не сапсаваўся зрок, будзем праводзіць апытанні пра зручнасць, а таксама з пункта гледжання пэўных сацыяльных момантаў (ці не разаўецца, скажам, залежнасць ад прылады). Эксперымент важны для ўсёй сістэмы адукацыі. Сёння рыдары яшчэ крыху дарагаватыя, але праз 10 гадоў яны могуць стаць даступныя кожнаму (як было з мабільнымі тэлефонамі). Таму трэба сёння высветліць усе магчымыя хібы. Нашы ліцэісты з задавальненнем прынялі ініцыятыву, падключаюць, глядзяць, абменьваюцца – ім стала цікавей вучыцца.



Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

*Навучэнцы ліцэя БДУ знаёмяцца з новымі электроннымі прыладамі*

***– А ці маюць студэнты доступ да суперкамп'ютарнага цэнтра, каб выпрабаваць яго неймаверныя магчымасці?***

– Натуральна, найчасцей да суперкамп'ютара звяртаюцца студэнты, выкладчыкі і навуковыя супрацоўнікі прыродазнаўчых факультэтаў, вырашаюць усемагчымыя задачы – фізічныя, хімічныя, камп'ютарнага мадэлявання (вельмі распаўсюджаныя лабараторныя працы). Усяго зараз працуюць са СКІФам каля 150 карыстальнікаў. Мы разумеем, што гэта першая спроба, і ўжо маем вялікі праект, падрыхтаваны сумесна з Нацыянальнай акадэміяй навук і кітайскімі інвестарамі, дзе прадугледжана набыць дадатковае абсталяванне для суперкамп'ютара і на некалькі парадкаў павялічыць яго магутнасці (да 50 тэрафлопс, то бок у 20 разоў! – *Рэд.*). Праект праходзіць экспертызу, і, магчыма, ужо ў наступным годзе мы значна пашырым магчымасці нашага суперцэнтра.

## САМ САБЕ РЭЖЫСЁР

***– Вось ужо цэлы год Вы ведзяце відэаблог на сайце БДУ – як уражанні?***

– Мне ўсё яшчэ цікава. Атрымліваю шмат водгукаў і каментарыяў. Гэта зручная форма, каб даступна распавесці пра важныя мерапрыемствы і падзеі ўніверсітэцкага жыцця, трымаць сувязь непасрэдна са студэнтамі і супрацоўнікамі – мне прыходзяць пытанні і па электроннай пошце, і ў блогу.

***– Надзвычай пранікнёнай атрымалася серыя Вашых пастоў пасля візіту ў Японію – асабліва чапляюць за душу аповеды пра наступствы аварыі на Фукусіме...***

– Я быў у Японіі сёмы раз, але, сапраўды, гэтае наведванне было азмрочана – ляцеў у красавіку і меў магчымасць назіраць, як краіна адольвае наступствы прыроднай і тэхнагеннай катастроф. Гэта насамрэч узор таго, як трэба згуртоўвацца і разам праходзіць праз цяжкасці, пра што я пасля неадназова гаварыў у сваіх выступах. Згуртавацца, прыняць павышэнне падаткаў і іншыя эканамічныя нягоды і абмежаванні, каб падрыхтаваць глебу для наступнага развіцця.

*Дзякуй Вам, Сяргей Уладзіміравіч, за такую магчымасць. Сапраўды, праз відэаблог вельмі зручна атрымліваць самую актуальную інфармацыю з першых вуснаў. Прычым Вы распавядаеце не толькі пра жыццядзейнасць БДУ, але і пра падзеі ў краіне (выбары, прыняцце кодэкса аб адукацыі, павышэнне кошту навучання і інш.). Да таго ж гэта добрая магчымасць для студэнтаў пабачыць рэктара на ўласныя вочы, бо, як Вы аднойчы прызналіся, самі за час навучання так і не зведалі, як выглядае кіраўнік ВНУ.*

## КВІНТЭСЕНЦЫЯ ЖЫЦЦЯ

***– Поруч з вядзеннем блога яшчэ адной нечаканай гранню асобы рэктара БДУ стала пісьменніцкая дзейнасць. Ваша аўтабіяграфічная кніга «Кібернетыка жыцця: разважанні акадэміка» прываблівае дакладным словам, лагічнай структурай – адразу адчуваецца, што кнігу пісаў чалавек з матэматычным мысленнем. Але як Вы, пры сваёй загружанасці, знайшлі час для напісання кнігі, ды яшчэ такой, якая ўтрымлівае багата фактычнага матэрыялу?***

– Ну, тое-сёе занатоўваю па жыцці, так што матэрыял назапашваўся паступова, а падчас таго адпачынку, які правёў у Японіі, акурат меў час скласці і ўпарадкаваць нататкі. Няпроста было рашыцца выдаць гэту кнігу – яшчэ і ўзрост не такі сур'ёзны, як для справаздачы за жыццё. Але потым пабачыў, які насычаны ідзе час – вось ужо дваццаць гадоў незалежнасці Беларусі, наша навука і адукацыя істотна трансфармаваліся, і гэта вельмі важна... А дзесьці падалося дарэчным паказаць свой шлях маладому чалавеку, які робіць першыя крокі ў навуцы: працуй нармальна – і ў цябе ўсё атрымаецца.

***– Пры канцы кнігі прыводзіцца ўнушальны спіс краін, дзе Вы пабывалі. Дзе найбольш спадабалася?***

– Зразумела, Беларусь – найлепшая краіна для пражывання, і я шчаслівы, што жыву тут. А іншыя краіны – кожная цікавая па-свойму. Краіны Азіі вабяць сваёй нязвыкласцю; Новая Зеландыя і Аўстралія – спакойныя і мяккія, там зручна жыць на старасці; афрыканскі кантынент – гэта спрэс экзотыка. Але нам, еўрапейскім людзям, найбольш пасуе наша краіна і яе асяроддзе: Цэнтральная і Усходняя Еўропа, дзе прыярытэты падобныя да нашых, гэтыя краіны зразумелыя і ясныя, ведаеш, чаго чакаць.



Фота Аляксандра СНАПКА

*СКІФ БДУ неўзабаве стане яшчэ больш магутным*

***– Разам з агульнымі ўражаннямі Вы атрымалі магчымасць параўнаць розныя сістэмы адукацыі – якія вартасці і недахопы можаце адзначыць, і якія перспектывы ў сувязі з гэтым бачыце для айчыны?***

– Зразумела, савецкая сістэма навукі і адукацыі была адной з наймацнейшых у свеце, гэта агульнапрызнана. Калі мы сталі незалежнай краінай, давялося выбудоўваць сваю сістэму. Беларусь гэта зрабіла паспяхова. З навуковых кірункаў, якія распрацоўвалі пасля СССР, у нас засталіся тыя тэарэтычныя, дзе мы моцныя на фоне сусветнага ўзроўню, а таксама тыя практычныя, якія неабходныя для рэальнага сектара эканомікі. І ад савецкай адукацыі мы здолелі ўзяць і захаваць найлепшую рысу – фундаментальную падрыхтоўку. А з такім багажом можна спакойна трансфармавацца далей разам з усім светам, напрыклад, адаптавацца да Балонскага працэсу, уніфікацыі адукацыйных заканадаўстваў. Магчыма, будзем выдаваць да дыпломаў дадаткі міжнароднага ўзору. Гэтыя пытанні зараз апрацоўваюцца на дзяржаўным узроўні, мы давалі свае прапановы, абмяркоўвалі на савеце рэктараў. Але не хочацца рэзкіх рухаў, трэба ўсё рабіць паступова, як мы, беларусы, і робім, і пры гэтым захоўваем найлепшае са старога. Нічым наша адукацыя не горшая за любую еўрапейскую. Натуральна, у кожнай краіне сустрэнем нешта спецыфічнае, але мы спакойна развіваемся, бяром ад свету выпрабаванае добрае.

## УВАГА ДА ЗАМЕЖНІКАЎ

***– Важны складнік дзейнасці ўніверсітэта – замежныя студэнты, што, дарэчы, уплывае і на міжнародны рэйтынг. Што робіцца ў БДУ, каб павялічыць плынь замежнікаў?***

– Тут, напэўна, наша самая вялікая праблема, як я ўжо казаў, гэта інтэрнаты. Калі б нам было куды засяліць замежнікаў – іх бы прыязджала значна больш. І толькі затым ідзе моўная праблема, над вырашэннем якой дбайна працуем: шчыруем над стварэннем магістратуры на англійскай мове, плануем і першую ступень адукацыі даваць па-англійску, падрыхтаваць гэта – доўгі і складаны працэс. Зрэшты, колькасць замежных грамадзян з 53 краін, якія атрымліваюць адукацыю ў БДУ, складае 2 030 чалавек, што перавышае паказчык 2007 г. у 2,6 раза. Колькасць замежных грамадзян, што навучаюцца ў магістратуры, павялічылася ў 2,3 раза. Усё гэта сведчыць пра рост аўтарытэту БДУ ва ўсім свеце.

***– Ваша ўвага да замежных студэнтаў праяўляецца, напрыклад, у правядзенні рэгулярных сустрэч з замежнымі навучэнцамі, а таксама ва ўдзеле, бадай, у першай урачыстай цырымоніі выпуску маладых замежных спецыялістаў, што адбылася ў БДУ ўлетку. Ім, верагодна, надоўга запомніцца...***

– Так, і мы плануем рабіць падобныя сустрэчы і выпускі штогод, актывізуем саюз зямляцтваў, зараз на святкаванне юбілею запрашаем шмат нашых іншаземных выпускнікоў. У нас вельмі добрыя стасункі з замежнікамі, што важна і патрэбна, таму, як магу, спрыяю і далейшаму развіццю міжнароднага сяброўства. У свой час мне самому давялося суседнічаць у інтэрнаце з хлопцам з Бангладэш, а пасля і з в'етнамскімі юнакамі, і гэта паўплывала на мой светапогляд. Было б добра, каб кожны наш студэнт таксама займеў падобны вопыт.

Напрыканцы я хацеў бы запрасіць усіх да ўдзелу ў святочных мерапрыемствах: тыдні моладзевай навукі ў БДУ, адкрыцці мемарыяльных дошак нашым слынным рэктарам У. Пічэту і А. Сеўчанку і ўрачыстым пасяджэнні вучонага савета з удзелам прадстаўнікоў Адміністрацыі Прэзідэнта, міністэрстваў і VIP-гасцей. У шэрагу забаўляльных мерапрыемстваў мега-dance-шоу «Нам – 90», канцэрт у Белдзяржфілармоніі, а таксама канцэрт самадзейных калектываў БДУ ў Палацы спорту.

Спадзяюся, што падчас урачыстасцяў кожны з нас зможа адчуць вялікі гонар за альма-матар і атрымае добры імпульс для творчай працы.

**Гутарыў**
**Сяргей ШАФАЛОВІЧ**

# Слова прарэктарам

***Такі велізарны комплекс, як БДУ, развіваецца па многіх напрамках. Кожны з іх курыруе прарэктар. Напярэдадні юбілею альма-матар мы звярнуліся да першых асоб нашага ўніверсітэта з трыма пытаннямі:***
***– Якія б Вы адзначылі важныя моманты ў жыцці БДУ за час сваёй дзейнасці?***
***– Што Вы лічыце найлепшым падарункам альма-матар да яе юбілею?***
***– Якім Вы бачыце ўніверсітэт праз 10 гадоў?***

### *Першы прарэктар БДУ прафесар Міхаіл ЖУРАЎКОЎ*



**I.** Жыццё ў БДУ настолькі насычанае падзеямі і мерапрыемствамі, што дастаткова цяжка вылучыць «асаблівыя». Вядома, кожны чалавек так ці інакш ацэньвае падзеі суб'ектыўна, прапускаючы іх праз сябе. У сувязі з гэтым я ў першую чаргу ўспамінаю значныя моманты свайго жыцця ў БДУ. Гэта прызначэнне мяне загадчыкам кафедры, уручэнне дыплома прафесара з нумарам 1, стварэнне НДЛ, прызначэнне дэканам ММФ, першым прарэктарам.

**II.** На мой погляд, найлепшы падарунак для Універсітэта – капітальны рамонт і будаўніцтва яго вучэбных, навуковых і вытворчых будынкаў і іх аснашчэнне сучасным абсталяваннем і мэбляй. Заканчэнне па плане будаўніцтва новага корпуса ФМА, здача сёмага інтэрната ў гэтым годзе не можа не радаваць.

**III.** Цяпер сістэма вышэйшай адукацыі ва ўсім свеце знаходзіцца напярэдадні карэнных змен. Усё часцей на розных узроўнях абмяркоўваецца пытанне: «Якой быць адукацыі будучыні?» Цалкам відавочна, што новыя тэхналогіі, якія сталі штодзённасцю ў нашым звычайным жыцці, «паламалі» стэрэатыпы, падыходы і нават прызначэнне і мэты навучання. Таму і нам ва ўніверсітэце неабходна сур'ёзна і вельмі актыўна займацца гэтай праблемай.

Я абсалютна ўпэўнены, што праз дзесяць гадоў БДУ будзе сучасным, адным з вядучых еўрапейскіх універсітэтаў, дзе будзе аптымальна спалучацца «ўніверсітэцкая базавая класіка» з выкарыстаннем ультрасучасных тэхналогій і методык, з шырокім наборам актуальных спецыяльнасцяў, куды будуць імкнуцца маладыя людзі з усяго свету.

### *Прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар Аляксей ТОЛСЦІК*



**I.** У БДУ я ўжо 30 гадоў, але апошні год для мяне быў асаблівым у сувязі з працай у рэктараце. Адзначу паспяховую прыёмную кампанію. Сёлета мы ўзялі на першы курс найвялікшую колькасць студэнтаў, больш за 6380, прычым радуе, што добры набор правялі прыродазнаўчыя факультэты. Адкрыты новыя спецыяльнасці, якія закладваюць асновы сучасных інавацыйных напрамкаў. Фестываль факультэтаў выклікаў вялікую цікавасць у абітурыентаў і саміх студэнтаў, якія бралі ў ім удзел.

**II.** Найлепшыя падарункі БДУ – гэта дасягненні саміх супрацоўнікаў, студэнтаў і аспірантаў. Яны ствараюць імідж універсітэту, робяць яго вядомым у сусветнай адукацыйнай і навуковай супольнасці. Прыемна, што ў год свайго юбілею ўніверсітэт істотна палепшыў свае пазіцыі ў сусветных рэйтынгах. Зараз Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт трывала трапляе ў дзясятку найлепшых ВНУ краін СНД, а таксама Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

**III.** На сваё 100-годдзе БДУ стане адной з вядучых ВНУ ў Еўропе. Далейшае развіццё атрымаюць міжнародныя кантакты, акадэмічныя абмены, студэнцкая мабільнасць. У навуку прыйдзе таленавітая моладзь. Візітоўка БДУ – якасць адукацыі і навуковых даследаванняў. Менавіта яднанне адукацыі, навукі і вытворчасці дазваляе забяспечыць якасную падрыхтоўку спецыялістаў па самых перадавых напрамках, якія вызначаюць развіццё сучаснага інавацыйнага грамадства.

### *Прарэктар па эканоміцы і інвестыцыях дацэнт Уладзімір ПАНАРАДАЎ*



**I.** Найбольш значнай падзеяй лічу стварэнне адзінага вучэбна-навукова-вытворчага комплексу БДУ. 27 адукацыйных устаноў, 3 музеі, 4 НДІ, 9 навуковых цэнтраў, 11 вытворчых прадпрыемстваў са штатам больш за 500 чалавек. Мы адзіныя з ВНУ Беларусі з такой складанай і перспектыўнай структурай. Але быць першымі – заўсёды не проста.

**II.** Што можа быць для ВНУ падарункам лепшым, чым новае ўнікальнае абсталяванне, новы студэнцкі інтэрнат, новы навучальны корпус? Мы ўсё гэта маем. І самае яркае – будынак ФМА, які будзе здадзены ў найбліжэйшы час.

**III.** Думаю, што і праз 10 гадоў універсітэт будзе спалучаць у сабе ўсе тры складнікі сённяшніх поспехаў: адукацыю, навуку і вытворчасць.

*Адукацыя.* Сёння актыўна ўводзяцца новыя спецыяльнасці і спецыялізацыі. Мяркую, будуць карыстацца вялізнай папулярнасцю кафедры, а можа нават факультэты нанатэхналогій, атамнай энергетыкі, аэракасмічных і біятэхналогій.

*Навука.* 400 дактароў і 1800 кандыдатаў навук выкладаюць і выконваюць даследаванні ў БДУ. Побач з імі амаль 30 тысяч маладых, дапытлівых розумаў. Таму без сумненняў праз 10 гадоў менавіта Універсітэт будзе на чале ўсіх навуковых адкрыццяў і вынаходстваў.

*Вытворчасць.* Прадпрыемствы і цэнтры ўжо зараз даюць больш за 30 % бюджэту БДУ. У нас велізарная колькасць навукова-тэхнічных распрацовак, і, я спадзяюся, прыбытак прадпрыемстваў разам з дзяржаўнай падтрымкай дасць магчымасць рэалізоўваць самыя смелыя навукова-адукацыйныя праекты.

### *Прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях дацэнт Уладзімір СУВОРАЎ*



**I.** Вядома, кожны бачыць жыццё БДУ праз прызму сваіх абавязкаў. Менавіта тыя задачы, да вырашэння якіх асабіста датычны, вызначаюць запамінальныя моманты. Для мяне гэта станаўленне студэнцкіх органаў самакіравання, студэнцкіх арганізацый і аб'яднанняў у БДУ, развіццё студэнцкіх СМІ, арганізацыя праектных формаў працы са студэнтамі... Безумоўна, важным з'яўляецца зацвярджэнне кіраўніком дзяржавы Статута БДУ. Істотным заўсёды быў удзел БДУ ў выбарчых кампаніях рознага ўзроўню. Ёсць яшчэ адзін падыход: жыццё БДУ – гэта інтэгральнае панацце, якое аб'ядноўвае адчуванні КОЖНАГА члена калектыву. І часам, калі атрымліваецца вырашыць чыюсьці асабістую праблему ці падтрымаць канкрэтнага чалавека або невялікі калектыў, то зведваеш высокае пачуццё задавальнення ад важнасці і правільнасці зробленага.

**II.** Новы інтэрнат у студэнцкай вёсцы, 113-кватэрны дом для выкладчыкаў і навуковых работнікаў, амаль гатовы корпус ФМА на Прывакзальнай плошчы – усё гэта цудоўныя і годныя падарункі. Але, на мой погляд, самы дарагі падарунак – гэта энтузіязм, энергія, інтэлект, дабрыня і шчырасць кожнага работніка, накіраваныя на росквіт БДУ.

**III.** Гэта будзе вялікая сям'я, дзе старэйшыя нясуць адказнасць за малодшых, а малодшыя хочуць быць вартымі старэйшых. Мы разам будзем старацца выбудаваць гэтыя адносіны. Выдатныя словы: *у галоўным – адзінства, у другарадным – свабода, і ва ўсім – любоў!*

### *Прарэктар па навуковай рабоце акадэмік Алег ІВАШКЕВІЧ*



**I.** Галоўнае, што ва ўніверсітэце вядзецца сістэмная праца, каб ён стаў сапраўдным вучэбна-навукова-вытворчым комплексам. Раней мы ўсе ў той ці іншай ступені былі раз'яднаныя. Інстытуты працавалі самастойна, не было ніякіх руху ў бок фарміравання міждысцыплінарных навуковых цэнтраў. А гэта будучыня навукі. Цяпер мы больш кансалідаваныя, перш за ўсё факультэты прыродазнаўчага профілю і цэнтры, і ўяўляем, куды рухацца далей. Нашы прадпрыемствы ўсё больш уключаюцца ў навукова-інавацыйную дзейнасць. І гэта вельмі важна.

**II.** Нядаўна ўказам прэзідэнта была зацверджана новая рэдакцыя Статута БДУ. Справа ў тым, што БДУ не падпадае ні пад адзін тып ВНУ ў новым кодэксе аб адукацыі. І ў класічным тыпе там не прадугледжвалася існаванне інстытутаў і цэнтраў са статусам юрыдычнай асобы, прадпрыемстваў, тэхнапаркаў і г. д. Была праведзена вялікая праца і рэктаратам, і рэктарам асабіста, і нашым упраўленнем прававой работы. У выніку нам пайшлі насустрач у міністэрстве і ў Адміністрацыі Прэзідэнта. Захаванне цяперашняй структуры дасць магчымасць БДУ эфектыўна развівацца. Гэта і ёсць найлепшы падарунак.

**III.** Тут я зноў адзначу міждысцыплінарныя навуковыя даследаванні. Першыя крокі зробленыя ў гэтым годзе. Мы стварылі міжкафедральны цэнтр – кафедру прыродазнаўча-навуковай адукацыі БДУ. Яна будзе рыхтаваць шматпрофільных спецыялістаў-менеджараў для нашых біясферных рэзерватаў – гэта Белавежская пушча, Бярэзінскі запаведнік. 2 лістапада ў Парыжы адбудзецца прэзентацыя новага міжнароднага біясфернага рэзервата Беларусь–Польшча–Украіна–Заходняе Прыбужжа. Мы ў гэтым бяром актыўны ўдзел. Будуць рыхтавацца спецыялісты адначасова ў галіне хімічнай экалогіі, геаэкалогіі, гідрабіялогіі, батанікі, фізікі, г. зн. спецыялісты зусім іншага ўзроўню. Таксама цяпер у стадыі станаўлення агульнаўніверсітэцкі вучэбна-навуковы цэнтр нанаматэрыялаў і нанатэхналогій на базе НДІ ядзерных праблем. Усе сур'ёзныя адкрыцці цяпер робяцца на стыку навук.

### *Прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар Уладзімір КЛЮНЯ*



**I.** Узгадаю шмат важных падзей:

– Стварэнне гуманітарнага факультэта, Інстытута імя святых Мяфодзія і Кірылы, музея гісторыі БДУ;

– Адкрыццё новых спецыяльнасцяў і спецыялізацый;

– Падрыхтоўка і выданне кніг па гісторыі ўніверсітэта, серыя «Класічнае ўніверсітэцкае выданне»;

– Падрыхтоўка магістраў у рамках Сеткавага ўніверсітэта;

– Адкрыццё новага корпуса на Кальварыйскай, інфапункта Савета Еўропы і шмат іншых падзей, якія пакінулі свой след у гісторыі БДУ.

**II.** Не думаю, што па вялікім рахунку БДУ мае патрэбу ў нейкіх асаблівых падарунках, бо БДУ – неацэнны падарунак для ўсёй сістэмы вышэйшай адукацыі краіны. Гэта і пацвярджае яго 90-гадовая гісторыя. Гісторыя, у якую слаўныя старонкі ўпісаны тымі, хто стаяў ля вытокаў БДУ, і тымі, хто працуе сёння.

**III.** Упэўнены, што Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт быў, ёсць і застанецца вядучай вышэйшай навучальнай установай краіны, цэнтрам падрыхтоўкі нацыянальных кадраў.

### *Прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце Уладзімір РАГАВІЦКІ*



**I.** Адзначу будаўніцтва кацельні ў САК «Брыганціна», што дазволіла мець цэлы год цяпло і гарачую ваду, увод у эксплуатацыю УСК «Універсітэцкі» і футбольнага поля са штучным пакрыццём, навучальнага корпуса па вул. Кальварыйская, 9, двух інтэрнатаў пасля капітальнага рамонту і будаўніцтва новага ў студэнцкай вёсцы.

**II.** Было б нядрэнна атрымаць да 90-годдзя 90 млрд руб. для развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы ўніверсітэта (праўда, ужо позна – не паспеем асвоіць), а калі да 100-годдзя, то 100 млрд руб. :)

**III.** Праз 10 гадоў БДУ – гэта вядучы ўніверсітэт краіны, які сабраў найлепшыя прафесарска-выкладчыцкія, навуковыя кадры і, вядома, найлепшых студэнтаў – разумных, прыгожых, крэатыўных. Гэта ВНУ з новымі навучальнымі карпусамі, лабараторыямі, аўдыторыямі, спартыўнымі збудаваннямі, са сваёй вялікай канцэртнай залай (у нас шмат выдатных калектываў мастацкай самадзейнасці), каб было дзе сябе паказаць....

# НАМ ЁСЦЬ КІМ ГАНАРЫЦЦА

***Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт займае асаблівае месца ў айчыннай навуцы. Для гэтага БДУ прайшоў вялікі шлях.***

Калі ўзгадаць тых, хто стаяў ля вытокаў беларускай навукі, то сярод першых будуць прафесары У. І. Пічэта, М. М. Нікольскі, У. М. Перцаў, Д. А. Жарынаў, Ф. Ф. Турук (гісторыя), І. І. Замоцін, Я. Ю. Лёсік, П. А. Бузук, Я. І. Барычэўскі (філалогія), М. Ф. Бліядуха (геалогія), Б. М. Беркенгейм, М. А. Прыляжаеў (хімія), У. К. Дыдырка (матэматыка), Я. Е. Сіроцін, А. К. Успенскі (фізіка), М. Б. Кроль, С. М. Мелкіх (медыцына) і інш.

«Бацькамі-заснавальнікамі» ўніверсітэта можна назваць Я. Ф. Карскага і М. В. Доўнар-Запольскага. Менавіта яны распрацавалі першую канцэпцыю стварэння БДУ і абодва шмат зрабілі для таго, каб на працу ў Мінск былі запрошаны найлепшыя прадстаўнікі ўніверстітэцкай адукацыі і навукі. М. В. Доўнар-Запольскі праводзіў агітацыю, знаходзячыся ў Кіеве, а потым – у Баку, Я. Ф. Карскі – непасрэдна праз свой удзел у рабоце камісій па стварэнні БДУ.

З шэрагу выдатных дзеячаў універсітэта вылучаецца прафесар Д. П. Канчалоўскі, які прачытаў першую ў гісторыі БДУ лекцыю. Дзмітрый Пятровіч быў чалавекам шырокай эрудыцыі, валодаў нямецкай, французскай, англійскай і італьянскай мовамі. Ён быў асабіста запрошаны ва ўніверсітэт першым рэктарам У. І. Пічэтам.

Міхаіл Барысавіч Кроль уваходзіў у склад камісіі па арганізацыі БДУ. Быў дэканам медыцынскага факультэта (1921–1930 гг.), адначасова першым дырэктарам Беларускага дзяржаўнага інстытута фізіятэрапіі (1924–1930). Першы загадчык клінікі нервовых захворванняў медфака БДУ. Як вопытны неўрапатолаг быў асабістым доктарам У. І. Леніна у 1923–24 гг. Аўтар больш чым 120 навуковых прац.

Восенню 1928 г. перабраўся ў Мінск прафесар-фізік Якаў Громер, амаль адзіны вучань А. Эйнштэйна. Яўрэй беларускага паходжання, Громер паступіў на працу ў БДУ з Берліна і адразу атрымаў кафедру, а ў хуткім часе выступіў з навуковым дакладам на чарговай Усебеларускай фізіка-матэматычнай канферэнцыі.

Цікавай асобай беларускай навукі 1920-х гг. быў Іван Іванавіч Замоцін. Не з'яўляючыся беларусам па паходжанні, ён за два гады дасканала вывучыў беларускую мову і стаў адным з заснавальнікаў беларускага літаратуразнаўства. Быў першым загадчыкам кафедры беларускай літаратуры і этнаграфіі БДУ, укладальнікам і рэдактарам выданняў твораў М. Багдановіча, А. Гаруна, П. Труса, Цёткі і інш.

Наогул, за 20-я гады XX ст. архіўныя крыніцы называюць 100 прозвішчаў прафесараў і 442 прозвішчы прадстаўнікоў «навукова-выкладчыцкага складу», працоўная дзейнасць якіх была звязана з БДУ.

Характэрнай рысай развіцця навукі ва ўніверсітэце ў 1920-я гг. было яе ўключэнне ў агульны еўрапейскі і сусветны кантэкст. Былі ўсталяваны навуковыя кантакты даследчыкаў БДУ з калегамі з Польшчы, Чэхаславакіі, Літвы, Германіі, Англіі, Францыі, ЗША і нават Японіі.

З пачатку 1930-х гг. як для ўніверсітэта, так і для краіны наогул пачаўся вельмі складаны перыяд. БДУ больш за іншыя навучальныя установы пакутаваў ад рэпрэсій. У 1937–1938 гг. былі арыштаваны гісторыкі А. М. Ляўданскі, У. І. Кернажыцкі, М. А. Поташ, фізік Я. К. Успенскі, хімікі Э. В. Змачынскі, Н. В. Ярмоленка, эканаміст дацэнт БДУ А. І. Шэйнін і інш. З рэктараў, якія ўзначальвалі ўніверсітэт у даваенныя гады, падвергліся рэпрэсіям У. І. Пічэта, Я. П. Каранеўскі, І. Ф. Ермакоў, А. І. Дзякаў, Н. М. Бладыка, У. С. Бабраўніцкі.

Тым не менш напярэдадні свайго 20-годдзя ўніверсітэт стаў сапраўднай кузняй кадраў для маладой БССР. Урачыстыя мерапрыемствы ў гонар святкавання юбілею БДУ павінны былі пачацца 24 чэрвеня. Але пачалася вайна. У суровых абставінах многія навукоўцы працягвалі сваю працоўную дзейнасць. Напрыклад, выпускнік фізіка-матэматычнага факультэта БДУ А. Н. Сеўчанка (будучы рэктар універсітэта ў 1957–1978 гг.) працаваў у Ленінградскім дзяржаўным аптычным інстытуце. Дзякуючы яму былі вырашаны праблемы стварэння адзінай святломаскіроўкі грамадскіх і ваенных аб'ектаў. Прафесар М. Ф. Ярмоленка, былы загадчык кафедры калоіднай хіміі БДУ, праводзіў даследаванні па ачыстцы бензіну з дапамогай глін і баксітаў. Тагачасны рэктар універсітэта П. П. Савіцкі да студзеня 1943 г. працаваў дырэктарам Ніжнетагільскага пединстытута.

Цікавую гісторыю мае навуковая праца прафесара Мікалая Міхайлавіча Нікольскага «Эцюды па гісторыі фінікійскіх абшчынных і земляробчых культаў», выдадзеная ў 1948 г. Сама праца была напісана ў акупаваным Мінску. У пачатку вайны Нікольскаму ўжо было за 60 гадоў, ён спрабаваў эвакуявацца, але не паспеў – немцы ўжо занялі горад. Тады навуковец вярнуўся і пачаў працаваць над абранай тэмай. Сродкі для жыцця Нікольскі з жонкай атрымлівалі за кошт продажу ўласных рэчаў. У 1943 г. праца была скончана, а апублікавана ўжо пасля вайны.

У 1950–70-я гг. кардынальна змяняюцца змест, формы і метады вучэбнага працэсу і навуковых даследаванняў. Універсітэт пашыраецца, засвойвае новыя галіны навуковых ведаў. Вялікую даследчую дзейнасць у 1950-я гг. вялі прафесары Б. І. Сцяпанаў, А. Н. Сеўчанка, Ц. М. Годнеў, Г. Г. Вінберг, Б. В. Ерафееў, К. І. Лукашоў, А. Д. Мышкіс. Навуковая работа была скіравана на распрацоўку важных праблем, якія мелі гаспадарчае значэнне. Фізічнымі кафедрамі вывучаліся пытанні ў галіне спектраскапіі, люмінесцэнцыі, паўправаднікоў. Матэматычнымі кафедрамі асноўная ўвага надавалася дыферэнцыяльным і інтэгральным ураўненням, матэматычнаму аналізу і вышэйшай алгебры. Навукоўцы хімфака вялі працу па вывучэнні з'яў каталізу, гетэрагенных сістэм, адсорбцыі і інш. Калектыў біялагічнага факультэта асноўную ўвагу надаваў вывучэнню фотасінтэзу, павышэнню біялагічнай прадукцыі азёр, гібрыдызацыі кукурузы і інш. Калектывы гуманітарных факультэтаў даследавалі пытанні гісторыі Беларусі, беларускай мовы і літаратуры, эканомікі, філасофіі і г. д. Выкладчыкі геолага-геаграфічнага факультэта займаліся праблемамі прыродных умоў і рэсурсаў Беларусі, асабліва вывучэннем карысных выкапняў, салявых адкладаў, глін, лясоў і інш.

Буйное навуковае значэнне мелі работы прафесара М. М. Паўлючэнкі «Будова цвёрдых целаў і гетэрагенныя хімічныя рэакцыі», прафесара Ф. І. Фёдарава «Даследаванне крышталяў у адлюстраваным святле», прафесара Г. Л. Старобінца «Сарбацыя бінарных сумесяў насычаных пароў каўчукападобнымі высокапалімерамі», прафесара М. Р. Ларчанкі «Станаўленне і развіццё рэалізму ў беларускай літаратуры XIX стагоддзя» і інш.

З пачаткам асваення касмічнай прасторы Савецкім Саюзам была створана Мінская візуальна-аптычная станцыя, якая з'яўлялася лабараторыяй фізіка-матэматычнага факультэта БДУ. Менавіта пад гэтыя мэты была створана астранамічная пляцоўка, якая размясцілася на даху будынка пединстытута імя Максіма Горкага (зараз – БДПУ імя Максіма Танка). Па выніках назіранняў рабіліся адпаведныя вылічэнні, якія затым перадаваліся ў Маскву.

1960-я гады сталі часам, калі БДУ канчаткова набыў класічную форму вышэйшай навучальнай установы Беларусі. Гэта была несумненная заслуга як усяго калектыву БДУ, так і яго кіраўніцтва на чале з тагачасным рэктарам А. Н. Сеўчанкам. Ва ўніверсітэце разгарнулася праца такіх выдатных навукоўцаў, як акадэмік М. А. Ельяшэвіч, найбуйнейшы спецыяліст у галіне тэарэтычнай спектраскапіі, прафесар А. Я. Левашоў, заснавальнік беларускай навуковай школы па гравітацыі, акадэмік М. Л. Сірата, аўтар даследаванняў па фізіцы і хіміі цвёрдага цела, і інш.

1970–1980-я гады. былі часам сапраўднага росквіту навук. Актыўна праводзіліся вопыты на хімічным факультэце, набіралі моц гуманітарныя навукі, паспяхова развівалася эксперыментальная біялогія. Але самыя значныя дасягненні былі зроблены ў фізіцы. У. Р. Барышэўскі ў 1979 г. стаў аўтарам першага ў гісторыі БДУ і ў сістэме вышэйшай школы навуковага адкрыцця. А ў 1981 г. было зарэгістравана яго другое адкрыццё. Уладзімір Рыгоравіч з'яўляецца адзіным навукоўцам у Беларусі, на рахунку якога два такія дасягненні. На аснове навуковых адкрыццяў Барышэўскага быў створаны першы ў свеце лазер на свабодных электронах, які прымяняецца ў біялогіі, медыцыне, хіміі і г. д. З 1986 г. У. Р. Барышэўскі з'яўляецца дырэктарам НДІ ядзерных праблем БДУ.

Негледзячы на крызіс пачатку 1990-х гг., навукоўцы ўніверсітэта дасягалі навуковых вяршынь. У кастрычніку 1993 г. быў атрыманы першы прыз міжнароднай канферэнцыі па высокіх тэхналогіях (г. Хаген, Германія) за навуковую работу «Алмаз у мікраэлектроніцы» (аўтары – А. М. Зайцаў, А. А. Мельнікаў, В. С. Варычэнка і іншыя з кафедры фізікі паўправаднікоў). Дырэктар НДІ ЯП прафесар У. Р. Барышэўскі ў снежні 1993 г. быў абраны членам Нью-Ёркскай акадэміі навук. На механіка-матэматычным факультэце пад кіраўніцтвам дацэнта В. П. Супруна былі распрацаваны новыя лагічныя схемы тыповых прылад вылічальнай тэхнікі.

У кастрычніку 1993 г. Вучоным саветам БДУ было зацверджана палажэнне аб прэміях за выдатныя дасягненні – прэмія імя У. І. Пічэты ў галіне гуманітарных навук і прэмія імя А. Н. Сеўчанкі ў галіне прыродазнаўчых навук. Першымі лаўрэатамі сталі вядомы ўсходазнаўца, загадчык кафедры гісторыі новага і найноўшага часу, прафесар У. С. Кошалеў і вядомы энтамолаг, загадчык кафедры заалогіі, прафесар І. К. Лапацін.

Юрысты ўніверсітэта бралі ўдзел у распрацоўцы праекта Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (прафесары А. А. Галаўко, В. Ф. Чыгір, М. Г. Юркевіч, І. А. Юхо, С. Г. Драбязка, дацэнты В. М. Гадуноў, М. Ф. Чудакоў, А. Я. Вашкевіч).

У 2000-я гг. даследаванні такіх выбітных навукоўцаў, як М. В. Арцем'еў, М. Я. Кавалёў, Г. Я. Кабо, М. В. Коржык, С. А. Максіменка і інш. публікуюцца ў прэстыжных замежных выданнях і маюць высокі індэкс цытавання.

Акрамя таго, сёння ў комплексе БДУ дзейнічае 11 навукова-вытворчых унітарных прадпрыемстваў, большасць з якіх сфарміравалася на аснове даследчых лабараторый і інстытутаў БДУ. Наша прадукцыя пастаўляецца ў арганізацыі і фірмы многіх краін. У асартыменце абсталяванне, новыя рэчывы і матэрыялы, новыя тэхналогіі, апаратныя і праграмныя сродкі.

Дзякуючы агульным намаганням калектыву БДУ за апошнія гады істотна ўзрос аўтарытэт БДУ ў свеце. Так, па ацэнцы Webometrics, БДУ займае высокую 1208-ю пазіцыю ў рэйтынгу з 13 тыс. ВНУ. Такім чынам, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт можа ганарыцца сваёй гісторыяй і сучаснасцю.

**Падрыхтавала па матэрыялах музея К. ЧАРНЯЎСКАЯ**



*П.М. Машэраў сярод выкладчыкаў БДУ (побач У. Р. Барышэўскі)*



*Студэнты БДУ і пединстытута назіраюць за штучным спадарожнікам*



*К. ф-м. н. І.Р. Некрашэвіч і н. с. А.А. Лабуда*



*Рэктар МДУ В.А. Садоўнічы падпісвае дамову аб супрацоўніцтве*



*Студэнты фізмата на занятках у лабараторыі. 1947 г.*



*Падпісанне дамовы з Сафійскім універсітэтам. 1971 г.*



*Візіт міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР В. П. Ялюціна ў БДУ. 1981 г.*

# ВЫХАВАНЦЫ БДУ ЎСЛАЎЛЯЮЦЬ

**За 90 гадоў дзейнасці Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт даў пуцёўку ў жыццё каля 150 тыс. маладых спецыялістаў, у тым ліку больш чым 7 тыс. для іншых краін. З цягам часу многія выхаванцы БДУ выраслі ў выбітных выкладчыкаў, навукоўцаў, грамадскіх дзеячаў, буйных кіраўнікоў і прадпрымальнікаў. Шмат хто з іх атрымаў прызнанне не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Некаторыя з такіх асоб павіншавалі альма-матар праз нашу газету.**

### В. С. СЦЁПІН
***Акадэмік РАН, ганаровы прафесар БДУ***



90 гадоў БДУ – гэта дзясяткі тысяч выпускнікоў, спецыялістаў у самых розных галінах дзейнасці, неабходных для ўзнаўлення і развіцця грамадскага жыцця.

У Рэспубліцы Беларусь БДУ справядліва займае месца найбольш прэстыжнай ВНУ. Ён уваходзіў у лік элітных ВНУ краіны ў савецкую эпоху і захаваў гэты статус сёння.

У свеце хуткіх перамен, у якіх мы жывём, важныя не толькі прафесійныя веды, але і агульны высокі ўзровень інтэлекту, які дазваляе дамагацца поспеху ў розных відах дзейнасці, што пастаянна абнаўляюцца і ўзнікаюць.

У злучэнні глыбокіх спецыяльных ведаў і агульнай адукаванасці, якая фарміруе творчы інтэлект, заключаецца галоўная задача сучаснай універсітэцкай адукацыі.

БДУ паспяхова спраўляецца з гэтай задачай. Жадаю яму ўмацоўваць і развіваць дадзеную традыцыю.

### Л. М. СУШЧЭНЯ
***Акадэмік АН СССР, Расійскай АН і НАН Беларусі***



Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт – мая alma mater. Ён даў мне пуцёўку ў жыццё і вывеў на прамую дарогу навукі. Я іду па ёй да гэтага часу, пераадолеўшы ўсе магчымыя межы.

Шлях БДУ быў, вядома, больш складаным, чым маё асабістае жыццё. Ён прайшоў некалькі гістарычных эпох і цяпер горда нясе сцяг вышэйшай універсітэцкай адукацыі ў незалежнай Беларусі.

Гады, праведзеныя ў сценах БДУ, найлепшы перыяд майго жыцця. Я кожны раз успамінаю мілы майму сэрцу біяфак і выдатную кагорту прафесараў, якія нас навучалі. Нельга забыць такіх майстроў сваёй справы, як акадэмікі Ц. М. Годнеў, М. Е. Макушок, Н. А. Дарожкін, член-кар. АН СССР Г. Г. Вінберг (мой настаўнік), І. М. Сяржанін, праф. А. А. Зубкоў і многія іншыя.

Час ідзе, і ўжо змянілася некалькі пакаленняў выкладчыкаў і студэнтаў-біёлагаў. БДУ напружана працуе. На кожным этапе свецяць свае зоркі і загараюцца маленькія зорачкі. Дзеецца гісторыя. БДУ адзначае 90 гадоў з дня свайго заснавання. Я сардэчна віншую калектыў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта з гэтай датай, жадаю вам здароўя, дабрабыту і новых поспехаў на карысць роднай Беларусі.

### Р. Л. КІСЕЛЬ
***Старшыня праўлення ЗАТ «Другі нацыянальны канал»***



У гісторыі БДУ, як у люстэрку, адбіваюцца этапы развіцця нашай краіны. Больш за тое, ён быў і застаецца лідарам у адукацыйнай, навуковай, агульнакультурнай сферах жыцця беларускага грамадства. У апошнія гады ўніверсітэт аўтарытэтна заяўляе пра сябе на міжнародным узроўні. Няма сумневу, што ў найбліжэйшай будучыні Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт будзе стаяць у адным шэрагу з такімі сусветна вядомымі навучальнымі ўстановамі, як Сарбона ці Оксфард.

У Мінску няма ніводнага прадпрыемства ці арганізацыі, дзе б ні працавалі выпускнікі БДУ. Усе яны годныя прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі, якія спалучаюць глыбокую прафесійную падрыхтоўку і высокую грамадзянскую пазіцыю.

Мінчане ганарацца, што ў цэнтры беларускай сталіцы жыве і вучыцца, весяліцца і творыць цэлая студэнцкая «краіна». Мы ганарымся, што насельнікамі гэтай краіны становяцца найлепшыя людзі Беларусі, што настаўнікі іх шчодра дзеляцца сваімі ведамі, вопытам, далучаюць да высокай навукі і культуры.

Жадаю студэнтам і ўсім выпускнікам, усяму калектыву ўніверсітэта і ў далейшым высока несці найлепшыя традыцыі ўніверсітэта, творчых поспехаў у вучобе і працы.

### А. А. ТОЗІК
***Намеснік Прэм'ер-міністра Беларусі, прафесар***



Цяжка пераацаніць месца БДУ ў сучаснай сістэме адукацыі Беларусі, бо гэта і вядучы нацыянальны ўніверсітэт, і частка гісторыі краіны, наш гонар.

За высокім статусам вядучага ўніверсітэта краіны стаіць штодзённая самаадданая праца прафесарска-выкладчыцкага складу, дасягненні многіх тысяч яго выпускнікоў.

У 1971 г., выпускнік гістарычнага факультэта, я быў сведкам 50-гадовага юбілею роднага ўніверсітэта. Зараз, калі БДУ спаўняецца 90 гадоў, я з радасцю адзначаю, што ён па-ранейшаму першы ва ўсіх адносінах універсітэт краіны. Жадаю альма-матар, яе студэнтам, выкладчыкам і ўсім супрацоўнікам вялікай будучыні і новых выдатных поспехаў!

### С. А. ЧЫЖЫК
***Галоўны вучоны сакратар НАН Беларусі, член-карэспандэнт НАН Беларусі, д. т. н., прафесар***



БДУ за гады сваёй дзейнасці трывала зацвердзіўся як магутная дзяржаўная карпарацыя, якая аб'ядноўвае адукацыю, навуку і ўласную вытворчасць. Ён завяваў самыя высокія пазіцыі ў свеце і ўзначальвае спіс найлепшых ВНУ краіны. Мы, выпускнікі БДУ, з настальгіяй успамінаем гады кіпучага студэнцкага жыцця, сваіх выкладчыкаў, ганарымся сваім дачыненнем да нашага ўніверсітэта.

Жадаю Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту росквіту. Выкладчыкам – талковых студэнтаў, навуковых дасягненняў сусветнага ўзроўню, здароўя і дабрабыту. Студэнтам усіх факультэтаў – займальнага, творчага, насычанага студэнцкага жыцця і высокай запатрабаванасці ў будучыні.

### А. В. ТУЗІКАЎ
***Генеральны дырэктар Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі НАН Беларусі, д. ф.-м. н., прафесар***



Белдзяржуніверсітэт выхаваў шмат выдатных прадстаўнікоў нашай краіны, якія з'яўляюцца нашым гонарам, інтэлектуальным капіталам Беларусі. Кожны, хто прайшоў навучанне ва ўніверсітэце, набыў не толькі новыя веды, а нешта значна большае, пабудаваў падмурак, жыццёвую аснову, якая дазваляе яму ўпэўнена будаваць жыццё. Я шчаслівы, што лёс даў мне магчымасць вучыцца ва ўніверсітэце, прасякнуцца яго духам і адчуваць сябе датычным да вялікай сям'і яго выпускнікоў. Шчыра віншую выкладчыкаў і студэнтаў, адміністрацыю ўніверсітэта і яго выпускнікоў з юбілейным днём нараджэння і жадаю, каб БДУ і далей заставаўся лідарам усёй сістэмы адукацыі ў Беларусі.

### С. А. УСАНАЎ
***Акадэмік-сакратар Аддзялення хіміі і навук аб Зямлі, дырэктар Інстытута біяарганічнай хіміі НАН Беларусі, член-карэспандэнт НАН Беларусі, д. х. н., прафесар***



З трапятаннем успамінаю гады, якія я правёў у БДУ на біяфаку з 1968 па 1973. Наш курс, як паказаў час, стаў адным з найбольш яркіх на факультэце. Цудоўныя лекцыі, якія нам чыталі вядомыя навукоўцы: І. М. Сяржанін, А. В. Канстанцінаў, Ю. К. Фамічоў, А. Ц. Пікулеў – не толькі адкрывалі нам шлях у нязведаны свет навукі, але і спрыялі фарміраванню светапогляду. А якія незабыўныя ўспаміны захаваліся пра летнюю практыку на возеры Нарач і ў Налібоцкай пушчы…

Праз гады сфарміраваны новы для Беларусі навуковы напрамак – даследаванне структуры і функцыі найважнейшых сістэм арганізма чалавека, атрыманы новыя вынікі сусветнага ўзроўню. Многія выпускнікі біялагічнага факультэта БДУ, прайшоўшы навучанне ў Інстытуце біяарганічнай хіміі НАН, выраслі ў знакамітых навукоўцаў, некаторыя працуюць у вядучых універсітэтах свету. Хацелася б пажадаць біялагічнаму факультэту БДУ і далей выконваць высакародную функцыю падрыхтоўкі добрых спецыялістаў для патрэб краіны.

### П. П. ЛАТУШКА
***Міністр культуры Рэспублікі Беларусь***



Віншую калектыў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта з 90-годдзем з дня заснавання БДУ!

БДУ з'яўляецца вядучай і прэстыжнай установай адукацыі. Багатыя традыцыі, прафесарска-выкладчыцкі склад, новыя тэхналогіі дапамагаюць працаваць у адпаведнасці з патрабаваннямі сучаснасці. Сёння ўніверсітэт сапраўды можа ганарыцца сваёй слаўнай гісторыяй, унікальнымі навуковымі распрацоўкамі, імёнамі сваіх выпускнікоў. Вялікі ўклад БДУ ў развіццё культуры Беларусі. Універсітэт стаў alma mater шматлікіх спецыялістаў, якія заклалі падмурак у вывучэнне пытанняў развіцця гісторыі і культуры нашай краіны і зараз рупліва працуюць на карысць нацыянальнай культуры.

БДУ ініцыюе і паспяхова рэалізуе шматлікія культурныя праекты, сярод якіх можна адзначыць міжнародны праект «Тэатральны куфар», фестываль эстрады БДУ і іншыя.

Аўтарытэт БДУ нязменна высокі і ў Беларусі, і далёка за яе межамі, а дыплом – сведчанне грунтоўнай прафесійнай падрыхтоўкі. Упэўнены, што калектыў ВНУ і ў далейшым будзе рыхтаваць кваліфікаваных і запатрабаваных спецыялістаў, уносячы свой важкі ўклад у развіццё культуры нашай краіны.

Жадаю вам далейшых поспехаў і росквіту.

### А. М. МАШЭНСКІ
***Генеральны дырэктар СП «Санта Импекс Брест»***



Шчыра рады павіншаваць выкладчыкаў, выпускнікоў і студэнтаў БДУ.

Нагода выдатная, і той факт, што наш універсітэт па-ранейшаму з'яўляецца самай прэстыжнай вышэйшай навучальнай установай Беларусі, гаворыць сам за сябе. Мне сапраўды пашанцавала, што гады вучобы прайшлі менавіта тут, дзе базавыя дысцыпліны, спорт і зносіны даюць магчымасць фарміраваць і прафесіянала і асобу.

Вядома, хочацца падзякаваць выкладчыкам і асобна сказаць дзякуй Амелькіну Валерыю Васільевічу (кафедра дыферэнцыяльных ураўненняў) і Рэйзіну Уладзіміру Міхайлавічу (кафедра фізвыхавання). А сённяшнім студэнтам магу толькі па-добраму пазайздросціць і пажадаць поспеху не толькі ў сесіі, якая мае адбыцца, але і ў жыцці, да якога іх рыхтуе мой любімы ўніверсітэт.

### Ф. М. КАПУЦКІ
***Загадчык аддзела НДІ ФХП. Акадэмік НАН Беларусі, д. х. н., прафесар. Рэктар БДУ (1990–1995)***



Якімі банальнымі ні здадуцца гэтыя словы, але ўніверсітэт для нас (тысяч і тысяч яго выпускнікоў, да ліку якіх адношуся і я, былы студэнт, а затым загадчык кафедры, дэкан і рэктар) – неад'емная частка жыцця, часцінка нас саміх. Гэта і праца, і прызванне, гэта асноўны інтарэс і кар'ерная лесвіца, гэта нашы мары, старанні, імкненні. Гэта тое, пра што ўспамінаеш усё жыццё і ніколі ўжо не забудзеш. Ды і як можна забыць свае найлепшыя гады, поўныя працы, надзей і адчування шчасця… Універсітэт – наша alma mater, якую ад усёй душы хочацца павіншаваць і якой пажадаць далейшага росквіту. З юбілеем!

### І. З. ЮРКІН
***Саветнік Выканаўчага камітэта СНД у сферы процідзеяння м/н тэрарызму, генерал-маёр***



Паважаныя калегі і сябры! Прыміце самыя добрыя словы віншаванняў у сувязі са слаўным юбілеем – 90-годдзем з дня ўтварэння БДУ.

Мой нізкі паклон усім, хто сёння вучыцца і працуе ў гэтай выдатнай навучальнай установе, а таксама ветэранам – выкладчыкам, прафесарскаму складу, чыімі намаганнямі ствараўся навуковая база ўніверсітэта, умацоўваўся яго аўтарытэт і вядомасць. Ад усёй душы вітаю і тых, хто ў розныя гады скончыў гэты вялікі храм навукі і паспяхова працаваў і працуе на карысць нашай Айчыны.

Жадаю ўсім здароўя, вялікіх творчых адкрыццяў, поспехаў і асабістага шчасця.

# АЛЬМА-МАТАР ПА ЎСІМ СВЕЦЕ

### А. І. ЖУК
***Першы намеснік міністра адукацыі Беларусі, д. пед. н., прафесар***



Сёлетні юбілей з'яўляецца гістарычна значным у развіцці айчыннай вышэйшай школы. Вы – годныя спадчыннікі і прадаўжальнікі вялікай адукацыйнай, навуковай і культурнай дзейнасці, пачатай 90 гадоў таму.

Доўгі час БДУ прыцягвае да сабе таленты і здольнасці, збірае ў сваіх сценах найлепшыя спелыя розумы і творчую моладзь, узбагачаючы грамадства навуковымі ідэямі, перспектыўнымі задумамі. У гэтым і ёсць найважнейшая місія ўніверсітэта, закліканага працаваць на будучыню краіны.

Упэўнены, што высокакваліфікаваны калектыў БДУ захавае вернасць слаўным традыцыям сваіх папярэднікаў, будзе і надалей уносіць годны ўклад у развіццё незалежнай Беларусі.

Жадаю калектыву альма-матар новых дасягненняў, а кожнаму выкладчыку і студэнту – шчасця, дабрабыту, творчага гарэння, поспехаў у навуковай і вучэбнай дзейнасці!

Паважаныя выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты БДУ!

Ад імя Міністэрства адукацыі і сябе асабіста сардэчна віншую вас з 90-годдзем з дня заснавання Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта! БДУ стаў першым класічным універсітэтам у Беларусі і сёння справядліва носіць званне вядучага нацыянальнага ўніверсітэта, з'яўляючыся інтэгратарам новых ведаў і навукова-інавацыйных распрацовак.

### П. І. ЯКУБОВІЧ
***Галоўны рэдактар газеты «СБ-Беларусь сегодня», ганаровы прафесар Інстытута журналістыкі***



Дарагія сябры!

Прыміце шчырыя віншаванні з нагоды 90-годдзя БДУ.

У далёкім 1921-м БДУ стаў першай у нашай краіне ВНУ і ўсе гэтыя гады застаецца флагманам вышэйшай адукацыі. З моманту заснавання ўніверсітэт падрыхтаваў звыш 140 тысяч спецыялістаў, многія з якіх шырока вядомыя не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. Вашы супрацоўнікі і выпускнікі ўнеслі велізарны ўклад у эканоміку і народную гаспадарку, адукацыю і навуку, дзяржаўнае будаўніцтва і культуру нашай краіны. Найлепшыя з іх удастоеныя высокіх званняў, абраныя акадэмікамі і членамі-карэспандэнтамі нацыянальнай і замежных акадэмій навук, з'яўляюцца лаўрэатамі дзяржаўных прэмій.

Сёння БДУ – не толькі вядучы ўніверсітэт у сістэме нацыянальнай адукацыі, але і буйны навукова-вытворчы комплекс, у якім разам з факультэтамі працуе мноства навукова-даследчых інстытутаў, цэнтраў і лабараторый. Усе вы, паважаныя сябры, робіце вялікую і важную справу!

Дасягненні ўніверсітэта высока шануюць у нашай роднай Беларусі і за мяжой. Пазіцыі БДУ ў сусветным рэйтынгу год ад году растуць. Так трымаць!

Ваш юбілей – радасная падзея і для нас. Бо сярод вашых выхаванцаў – і журналісты, якія працуюць у «СБ». Таму сёння, шчыра віншую вас са знамянальнай датай, жадаем вам захоўваць і памнажаць славутыя традыцыі, заставацца арыенцірам для іншых ВНУ і заўсёды крочыць у нагу з часам: удасканальваць навучальны працэс, укараняць новыя тэхналогіі, развіваць міжнароднае супрацоўніцтва. Упэўнены, наперадзе вас чакаюць маштабныя і гучныя здзяйсненні, а ў летапіс БДУ вашымі стараннямі будзе ўпісана шмат яркіх старонак!

Са святам!

### Н. М. МАЗАЙ
***Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы***



Віншую кіраўніцтва, выкладчыкаў, студэнтаў, усіх, каму выпала шчасце прайсці школу БДУ, з 90-годдзем універсітэта.

У гэтыя дні ўсе мы будзем падводзіць вынікі і адзначаць вялікі ўклад БДУ ў навуку, падрыхтоўку кадраў, развіццё вышэйшай школы краіны. Будуць гучаць заслужаныя словы шчырай падзякі ад выпускнікоў і добрыя пажаданні.

БДУ мае права ганарыцца сваёй слаўнай гісторыяй. Яна напоўнена значнымі здзяйсненнямі, яркімі імёнамі таленавітых навукоўцаў і педагогаў, дзяржаўных дзеячаў і выдатных спецыялістаў – тых, хто падзвіжніцкай працай ствараў славу БДУ, і тых, хто годна памнажае яе сёння.

Шчыра жадаю БДУ, усім, хто сёння ў ім вучыць і вучыцца, займаецца навуковымі даследаваннямі, поспехаў і росквіту.

Асаблівыя віншаванні і добрыя пажаданні роднаму гістфаку і нязменная велізарная ўдзячнасць за гонар быць выпускніком БДУ.

### В. С. КАМЯНКОЎ
***Старшыня Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь. Загадчык кафедры БДУ, д. ю. н., прафесар***



Калектыў Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь віншуе ўсіх супрацоўнікаў і студэнтаў БДУ з юбілеем вядучай ВНУ краіны!

Заснаваны 90 гадоў таму, БДУ стаў падмуркам беларускай вышэйшай школы. Ужо ў першыя гады існавання ўніверсітэта была закладзена ўнікальная навуковая база, якая дазволіла ў далейшым выпускаць высокакваліфікаваных спецыялістаў, што сталі апорай беларускай інтэлігенцыі. Імёны многіх з іх упісаны ў гісторыю нашай дзяржавы.

Сёння БДУ – гэта шматгадовая гісторыя, самабытныя традыцыі, шырокія міжнародныя сувязі.

Гэта сапраўдны навуковы цэнтр, які аб'ядноўвае шэраг навукова-даследчых інстытутаў, лабараторый, навукова-гаспадарчых баз.

На сучасным этапе БДУ актыўна ўдзельнічае ў мадэрнізацыі вышэйшай школы, ператварае ў жыццё самыя сучасныя і перадавыя тэхналогіі, а гэта – інвестыцыі ў паспяховую будучыню краіны.

Нягледзячы на свой «шаноўны ўзрост», ВНУ поўны жыццёвых сіл, бурліць энергіяй моладзі і гатовы да новых здзяйсненняў.

Здароўя, радасці, дабрабыту і натхнення кожнаму з вас!

### Р. А. ВАСІЛЕВІЧ
***Загадчык кафедры БДУ, д. ю. н., прафесар. Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь***



Шчыра віншую прафесарска-выкладчыцкі склад і ўсіх супрацоўнікаў, выпускнікоў нашай выдатнай вышэйшай навучальнай установы з 90-годдзем Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Дзякуючы высокай эрудыцыі педагогаў, адказнай працы супрацоўнікаў нашы студэнты атрымліваюць адукацыю на ўзроўні самых высокіх стандартаў, якія затым выкарыстоўваюць на практыцы, уносячы годны ўклад у эканамічны і сацыяльны дабрабыт беларускай дзяржавы.

Жадаю ўсім удачы, здароўя, поспехаў у прафесійнай дзейнасці.



### М. А. РУСАКОВІЧ
***Галоўны вучоны сакратар АІЯД у Дубне (Расія), д. ф.-м. н.***

Дарагія Настаўнікі, сябры і калегі!

Маладосць, вучоба, будатрады, мары, песні – усё гэта незабыўнае, і ўсё гэта для мяне – Мінск і БДУ. Ад душы віншую ўсіх вас з юбілеем нашага роднага Універсітэта і зайздрошчу тым, хто сёння прыходзіць у яго сцены. Будзьце здаровыя!

### А. І. КІРКОЎСКІ
***Віцэ-прэзідэнт кампаніі «Эфектыўныя праграмы»***



Я вельмі рады павіншаваць маю любімую ВНУ з 90-годдзем.

Сённяшні ўніверсітэт мне бачыцца добра адладжаным механізмам, які выпускае ў жыццё тысячы пісьменных спецыялістаў.

Мне прыемна бачыць, як дынамічна развіваецца мой ФПМ.

Я, як кіраўнік IT-кампаніі EffectiveSoft, з цяжкасцю сабе ўяўляю, як бы развівалася наша галіна без выпускнікоў майго факультэта.

Нават студэнты чацвёртага, а то і трэцяга, курса ўжо даволі тэарэтычна і практычна падрыхтаваныя, каб без усялякіх праблем праходзіць стажыроўку ў кампаніях IT-галіны.

Характэрна, што ва ўніверсітэце праглядаецца сістэмны падыход у падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, інтэграцыі адукацыйнага працэсу, арганізацыі вытворчай практыкі, працаўладкавання і адсочвання далейшага лёсу сваіх выпускнікоў.

Сёння словы «скончыць БДУ» з'яўляюцца сінонімам слоў «знайсці добрую працу». І ў гэтым я бачу заслугу выкладчыкаў маёй любімай ВНУ.

Зычу ўніверсітэту поспехаў, плённай працы яго выкладчыкам і далейшага прызнання яго заслуг!

### С. К. РАХМАНАЎ
***Намеснік Старшыні Прэзідыума НАН Беларусі. Член-карэспандэнт НАН Беларусі, д. х. н., прафесар. У мінулым – першы прарэктар БДУ***



З вялікім задавальненнем віншую цябе, мой родны ўніверсітэт, з 90-годдзем. Ты і малады і мудры. Пры гэтым ты лепшы. Тваё значэнне для нашай мілай Беларусі неацэннае.

Усё, што мы ўмеем і ведаем, таксама ад цябе. З табой мы знайшлі выдатную прафесію («шырока распасцірае хімія рукі свае ў справы чалавечыя»). «Родныя сэрцу паверхі» падарылі нам настаўнікаў і вучняў, сяброўства і каханне. У дзень юбілею – нізкі паклон табе, любімая alma mater.

Бачу цябе ў светлых і разумных тварах тых, з кім ішоў і іду па жыцці. Будзьце шчаслівыя, мае дарагія. Здароўя вам і ўдачы. Мы разам і будзем разам і ў святы і ў будні.

### Я. М. БАБОСАЎ
***Акадэмік НАН Беларусі***



Мне, як выпускніку БДУ, вельмі хацелася б, каб сённяшнія студэнты ўніверсітэта ва ўсім пераўзыходзілі нас. Яны валодаюць перавагай перад намі шмат у чым: лепш інфармаваныя, добра валодаюць камп'ютарнай тэхнікай, многія часта бываюць за мяжой, больш разняволеныя. Але (за рэдкім выключэннем) значна горш валодаюць навыкамі дыскусіі, іх цяжка, нават студэнтаў 4 і 5 курсаў, выклікаць на аргументаваны абмен меркаваннямі. А дарма, менавіта ў дыскусіі малады чалавек вучыцца адстойваць і даказваць сваю думку, сваю ідэю, свой пункт гледжання. Бо без гэтага не можа існаваць навука і практычнае прымяненне ведаў.

Я шчыра жадаю Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту поспехаў у рэалізацыі яго высокай місіі – падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, якія сучасна мысляць, патрыётаў сваёй Радзімы.

### В. А. САЛАДУХА
***Генеральны дырэктар ААТ «Інтэграл»***



Паважаныя калегі, сябры!

Ад імя шматтысячнага калектыву ААТ «Інтэграл» прыміце самыя шчырыя віншаванні з выдатнай датай – 90-годдзем з дня заснавання БДУ.

Раблю гэта з пачуццём глыбокага задавальнення не толькі як выпускнік БДУ, але і як кіраўнік, які нямала прапрацаваў з тымі, хто скончыў наш універсітэт. Высокі ўзровень тэарэтычных і практычных ведаў выпускнікоў БДУ дазваляе ім паспяхова працаваць у высокатэхналагічнай галіне навукі і тэхнікі – мікраэлектроніцы. Многія з іх сталі вядучымі спецыялістамі, кіраўнікамі рознага рангу. Упэўнены, што і ў далейшым ваш уклад у падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў для нашага прадпрыемства будзе такім жа важкім.

Шырока вядомая шматгранная навуковая дзейнасць вашых навукоўцаў, якая атрымала дастойнае прызнанне не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой.

Ад усёй душы жадаю ўсяму слаўнаму калектыву Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта здароўя, шчасця, дабрабыту, новых творчых і працоўных здзяйсненняў.

### А. І. ЛЕСНІКОВІЧ
***Загадчык кафедры агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі БДУ. Акадэмік НАН Беларусі, д. х. н., прафесар***



На думку антычнага мысліцеля Фукідыда, гісторыя – гэта філасофія ў прыкладах. Думаючы аб прыкладах шматлікіх добрых спраў супрацоўнікаў універсітэта за мінулыя 90 гадоў, міжволі адчуваеш, як мала зрабіў сам. У гэтыя юбілейныя дні хочацца пажадаць усім нам, паважаным калегі, паспяховага здзяйснення самых смелых задум на карысць роднага Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта! Прыміце мае шчырыя віншаванні з 90-годдзем альма-матар!

# Традыцыі ды навацыі адукацыйнага працэсу

***Адукацыйны працэс класічнага ўніверсітэта – велізарны будынак, які ўзводзіцца не адно пакаленне. Падобна архітэктурным творам, якія маюць гістарычную каштоўнасць, яго нельга кардынальна змяняць-перабудоўваць, але трэба падтрымліваць у добрым стане, прывабным для сучаснікаў. Як тое дасягаецца, спытаем у начальніка галоўнага ўпраўлення вучэбнай і навукова-метадычнай работы БДУ Людмілы ХУХЛЫНДЗІНАЙ.***



***– Прыёмная кампанія гэтага года ўдалася на славу – і абітурыентаў шмат, і прахадныя балы высокія. І гэта пры не дужа спрыяльнай дэмаграфічнай сітуацыі. Як жа ў БДУ атрымалася зняць пенкі?***

– Гэтым годам як ніколі добра была праведзена прафарыентацыйная работа. Па-першае, мы заключылі дамову пра супрацоўніцтва з Мінскім гарадскім аддзелам народнай адукацыі і працавалі ўшчыльную са школамі, у тым ліку праводзілі сустрэчы, арганізоўвалі курсы і праграмы паглыбленай падрыхтоўкі па цэлым шэрагу прадметаў, а да традыцыйных дзён адкрытых дзвярэй, што праводзяцца ўзімку і ўвесну на факультэтах, далучыліся выязныя – калі факультэты прэзентаваліся ў школах, гімназіях, ліцэях, сярэднеспецыяльных навучальных установах. Па-другое, у маі 2011 г. прайшоў фестываль факультэтаў. Далей, мы ўжо не першы год бяром удзел у выставе «Адукацыя і кар'ера», якая ладзіцца ў лютым у Рэспубліканскім палацы моладзі, і тры гады запар распавядаем пра БДУ на аналагічнай выставе, якая праходзіць у Гродзенскай вобласці. Шчыравалі таксама нашы моладзевыя арганізацыі, выязджалі ў раёны, дзе самі студэнты распавядалі, як хораша вучыцца ў БДУ, што, напэўна, уздзейнічае лепш, чым тая ж інфармацыя з вуснаў выкладчыка. Усе гэтыя намаганні далі эфект: колькасць нашых абітурыентаў была вялікай, нягледзячы на тое, што агульная колькасць абітурыентаў па краіне скарацілася. Мяркую, слоган «Стань студэнтам БДУ ў юбілейны год» таксама адыграў ролю...

А яшчэ прыток абітурыентаў абумоўлены тым, што мы адкрываем новыя спецыяльнасці, спецыялізацыі: «мікрабіялогія», «біяхімія» (біяфак), «космааэракартаграфія» (геафак), «фізіка нанаматэрыялаў і нанатэхналогій» (фізфак), «кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі» (ІБМТ), на спецыяльнасці «сацыяльная работа» адкрылі новы кірунак «сацыяльнае праектаванне» (гумфак).

**ПРЫЁМ У ЛІЧБАХ**

**120**
пераможцаў міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд

**448**
медалістаў і ўладальнікаў дыпломаў з адзнакай

**21 %**
ад колькасці залічаных – медалісты

**996**
ліцэістаў і гімназістаў

**819 (41,6 %)**
абітурыентаў набралі 300 балаў і больш

***– Важна не толькі набраць добрых абітурыентаў, але і ўтрымаць гэты моцны кантынгент – ці заўжды ўдаецца?***

– Гэта вялікая праблема, з ёй сутыкаемся не толькі мы, а бадай што ўсе ВНУ, і не толькі беларускія – праблема адаптацыі маладых людзей да навучання ў ВНУ. На жаль, радасныя вынікі прыёмнай кампаніі азмрочваюцца першай жа сесіяй: для паспяховага навучання ў ВНУ першакурснікам не хапае ведаў, атрыманых у школе. Апошнія пяць гадоў назіраем тэндэнцыю зніжэння абсалютнай паспяховасці студэнтаў па ўніверсітэце, у тым ліку і па першым курсе. Прычыны розныя, адна з іх – форма падрыхтоўкі да ўступных іспытаў. З аднаго боку, цэнтралізаванае тэсціраванне забяспечыла незалежную ацэнку ведаў і ранжыраванне абітурыентаў, з іншага боку, падмяніла сабой сістэмную падрыхтоўку па прадмеце, што стварае безліч праблем. Напрыклад, тыя, хто паступае на прыродазнаўчыя факультэты, развучваюцца рашаць задачы, дзе трэба праявіць логіку, бо дзеці скіраваны на іншыя працэсы, на ЦТ звычайна няма комплексных задач, і, да ўсяго, задачы даюцца сярэдняга ўзроўню, што, магчыма, не дазваляе выявіць сапраўдны талент. А гуманітарыі праз ЦТ адвыклі гаварыць і разважаць – для тэсціравання вывучваюць вызначэнні, даты, практыкуюць механічнае запамінанне, што накладае адбітак і на далейшую вучобу. Мы паспрабавалі вырашыць гэтыя праблемы так: пасля зімовай сесіі 2009–2010 гг. задумалі арганізаваць курсы, якія дазволілі б падцягнуць веды першакурснікаў па агульных дысцыплінах, летась увялі гэтыя курсы ў рабочыя планы, каб для выкладчыкаў факультэтаў можна было запланаваць адпаведную нагрузку, а ў гэтым годзе прадугледжваем яшчэ адну форму такой «падцягвальнай» працы – на ўсіх факультэтах ствараюцца групы па агульнаадукацыйных прадметах, і выкладчыкі факультэта даўніверсітэцкай адукацыі цягам верасня і кастрычніка праводзяць трэнінгі. Калі нехта ў школе не запомніў, скажам, што такое лагарыфм, дык цяпер не разбярэцца ў вышэйшай матэматыцы, прытым чым далей, тым горай – незразумелае назапашваецца, студэнт губляе цікавасць да вучобы, вынік сумны. Таму вялікая колькасць тых, хто запісваецца на агульнаадукацыйныя курсы, напрыклад, на біялагічным, геаграфічным, механіка-матэматычным, фізічным факультэце. Ахвота ў студэнтаў ёсць, тым больш што заняткі бясплатныя.

***– Увядзенне новых спецыяльнасцяў, адкрыццё новых кафедраў і нават пераназыванне факультэтаў – апрача гэтых заўважных змен, як ідзе абнаўленне навучальнага працэсу ў БДУ?***

– Разумееце, мы не можам хутка мяняць вучэбныя планы. Вучэбная работа – рэч даволі кансерватыўная. Цяперашні чацвёрты курс працуе па адукацыйных стандартах ужо другога пакалення (першае распрацоўвалася ў 1999–2001 гг., другое ў 2008 г., рыхтуецца трэцяе пакаленне). Змена каардынат адбываецца паступова, але ад навукі нельга адставаць, таму і абнаўленне навучальнага працэсу вядзецца пастаянна – за кошт спецыялізацый, іх за апошнія тры гады адкрыта каля 40. А пад іх распрацоўваюцца спецкурсы, якія можна штогод мяняць, каб не адставаць ад патрэб сучаснасці.

Што датычыць змены назвы факультэта радыёфізікі і электронікі, які ўсе ведаюць, якому споўнілася 35 год... Спецыялістаў-радыёфізікаў у нас рыхтуюць ужо паўстагоддзя, і за гэты час патрабаванні да іх, натуральна, змяніліся. Вялікая ўвага надаецца цяпер камп'ютарным тэхналогіям, на факультэце былі створаны запатрабаваныя часам спецыяльнасці «камп'ютарная бяспека», «прыкладная інфарматыка», «аэракасмічныя і інфармацыйныя тэхналогіі» (летась). Так што новая назва адпавядае, з аднаго боку, цяперашняй сутнасці факультэта, а з другога – сусветным тэндэнцыям у адпаведнай галіне.

***– А якія сусветныя тэндэнцыі ў адукацыі найбольш адчувальныя цяпер у БДУ? Многія нашы суседзі далучыліся да Балонскага працэсу...***

– Да еўрапейскай прасторы нам далучацца неабходна, безумоўна, і Балонскі працэс для нас непазбежны. Ён прадугледжвае некалькі рэчаў: па-першае, ступені адукацыі (бакалаўр, магістр і доктар), па-другое, мабільнасць студэнтаў, магчымасць уключацца ў адукацыйныя праграмы розных еўрапейскіх ВНУ, і, па-трэцяе, прызнанне дакументаў пра адукацыю і іх ідэнтычнасць у розных краінах. У дакументах пра адукацыю павінны выкарыстоўвацца такія адзінкі, якія будуць зразумелыя паўсюль, на ўсёй еўрапейскай адукацыйнай прасторы – тут выкарыстоўваецца сістэма ESCT, так званая сістэма крэдытаў. У нас выкарыстоўваюцца заліковыя адзінкі, якія дазваляюць ацаніць працавыдаткі студэнта на засваенне пэўнай адукацыйнай праграмы. Калі ішоў праект TEMPUS – развіццё бізнес-адукацыйных праграм па турызме, мы мусілі распрацаваць планы, якія былі б дастаткова блізкія да планаў заходніх краін. У гэтых планах заліковыя адзінкі прысутнічалі, дарэчы, як і ў адукацыйных стандартах другога пакалення, але для вучэбных планаў, распрацаваных на аснове гэтых стандартаў, заліковыя адзінкі пакуль не абавязковыя. Механізм трэба адладзіць па ўсёй краіне: якую колькасць акадэмічных гадзін мы будзем разумець пад гэтымі адзінкамі, як улічым гадзіны, неабходныя студэнту на самастойную падрыхтоўку...

**ДЭФІНІЦЫЯ**

Крэдыт – не ацэнка ведаў, а вызначэнне працаёмістасці дысцыпліны. Паводле заходніх патрабаванняў, крэдыты запісваюцца студэнту тады, калі ён адслухаў пэўную колькасць гадзін і атрымаў станоўчую адзнаку на іспыце / заліку.

***– Як размяркоўваецца час паміж лекцыямі, семінарамі і самастойным штудзіраваннем кніжак?***

– З 2001 года 20 % аўдыторных гадзін, прадугледжаных адукацыйным стандартам, выдаткавана для кантролю самастойнай работы студэнта. Частка матэрыялу аддаецца студэнту на самастойнае вывучэнне, а потым выкладчык мае час праверыць, як той матэрыял засвоены. Форму кантролю – тэст, калёквіум ці нешта яшчэ – абірае выкладчык. У вучэбных планах новага пакалення паменшана колькасць лекцыйных гадзін і павялічана колькасць практычных заняткаў.

***– Ацэнка ведаў дадае клопату?***

– Наяўную рэйтынгавую сістэму будзем захоўваць, яна добра сябе зарэкамендавала: забяспечвае кантроль за ведамі студэнтаў на працягу семестра, так што тое, як студэнт працуе цягам семестра, уплывае на яго выніковую адзнаку. Гэты працэс будзем удасканальваць. У новым палажэнні пра бягучую і выніковую атэстацыю ёсць пункт, адпаведна з якім рэйтынгавая сістэма можа ўводзіцца па жаданні ВНУ.

***– Сістэма менеджменту якасці адукацыі – яшчэ адно новаўвядзенне БДУ, за якім сочаць іншыя нашы ўніверсітэты. Ці можна ўжо казаць пра нейкія паляпшэнні, якія прынесла гэтая сістэма?***

– Праблема кантролю якасці была заўжды. Дзякуючы дадзенай сістэме пайшоў працэс упарадкавання дакументацыі – гэта першы важны момант, другі – улік такога паказчыка, як задаволенасць спажыўца, у нашым выпадку студэнта, выкладчыка, працадаўцы. Для гэтага праводзім сацыялагічныя апытанні.

Сістэма не можа даць імгненнага эфекту, але пэўнай упарадкаванасці ўжо ўдалося дасягнуць. Калі правілы, як трэба дзейнічаць, прапісаныя, прасцей праходзіць змена кадраў, забяспечваецца пераемнасць. Ну, напрыклад, учора на кафедры быў адзін лабарант, а заўтра прыйшоў іншы – новы чалавек можа ўзяць дакументы і паглядзець, што і ў якім парадку рабіць, і гэта, мяркуем, аблегчыць яму працу.

БДУ ўдзельнічае ў конкурсе на прэмію ўрада, мы падрыхтавалі справаздачу на 150 старонак, а з дадаткамі амаль 200. З намі спаборнічаюць БДУІР, Гродзенскі медыцынскі ўніверсітэт, навукова-даследчая частка БНТУ, адзін з тэхнікумаў. Ацэньваецца ўся работа ўніверсітэта – адукацыйная, навуковая, выхаваўчая, а таксама кадравая і фінансавая палітыка – усё-усё, нават дзейнасць газеты «Універсітэт»: якія публікацыі, якія рубрыкі... Рашэнне будзе прынятае ў лістападзе.

**Гутарыла**
**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**




Аналіз задаволенасці спажыўцоў

Апытанне выкладчыкаў.
Наколькі Вы задаволены кожным з наступных паказчыкаў, сярэдняя адзнака па факультэтах

| Паказчык | Адзнака па 5-бальнай сістэме |
|---|---|
| Адносіны з непасрэдным кіраўніцтвам | 4,4 |
| Адносіны з калегамі (на кафедры, у лабараторыі і да т. п.) | 4,4 |
| Адносіны з кіраўніцтвам факультэта | 4,3 |
| Адносіны са студэнтамі | 4,3 |
| Абслугоўванне ў бібліятэцы | 4,0 |
| Адносіны з адміністрацыяй універсітэта | 3,6 |
| Каштоўнасці, місія, палітыка і стратэгія ўніверсітэта | 3,6 |
| Стан аўдыторнага фонду для заняткаў | 3,3 |
| Аснашчанасць аўдыторый сучаснымі тэхнічнымі сродкамі навучання | 3,3 |
| Даступнасць камп'ютарных рэсурсаў і аргтэхнікі | 3,3 |
| Размеркаванне паўнамоцтваў у кіраўніцтве | 3,2 |
| Магчымасць аператыўнага размнажэння раздатачных матэрыялаў для заняткаў са студэнтамі | 3,1 |
| Магчымасць удзелу выкладчыкаў і іншых супрацоўнікаў у прыманні кіраўніцкіх рашэнняў | 3,0 |
| Магчымасці для заняткаў спортам | 2,8 |

# ПАЗІЦЫІ ЛІДАРА Ў НАВУЦЫ

***Навукова-даследчая частка – Галоўнае ўпраўленне навукі БДУ курыруе гаспадарча-дагаворную, навукова-даследчую і вопытна-канструктарскую работу ўсяго комплексу БДУ, які ўключае ўстановы з правам юрыдычнай асобы. Працэс яе стварэння як эфектыўнай структуры кіравання навуковай сферай ВНУ цягнуўся з 2000 па 2010 гг. Ва ўніверсітэце створаны неабходныя ўмовы для развіцця навукі: кадравы патэнцыял, навуковыя школы, матэрыяльна-тэхнічная база, пастаянны прыток таленавітых студэнтаў.***

***Якім чынам БДУ ўтрымлівае пазіцыі лідара ў навуковай сферы, мы пагутарылі з начальнікам НДЧ-ГУН доктарам фіз.-мат. навук Таццянай ДЗІК.***



***– Тацццяна Аляксееўна, у якіх праграмах БДУ ўдзельнічае апошнім часам? І чаму менавіта ўдзел у іх давераны нашым навукоўцам?***

– У 2011 г. навуковыя ўстановы БДУ і яго падраздзяленні выконваюць больш за 300 заданняў у 15 дзяржаўных праграмах навуковых даследаванняў, якія праводзяцца ў галіне прыродазнаўчых, тэхнічных, гуманітарных і сацыяльных навук. Сёння БДУ з'яўляецца галаўной арганізацыяй у 10 з 16 дзяржпраграм. Сярод іх – «Атамная энергетыка, ядзерныя і радыяцыйныя тэхналогіі і матэрыялы», «Функцыянальныя і машынабудаўнічыя матэрыялы, нанаматэрыялы», «Электроніка і фатоніка», «Прыродна-рэсурсны патэнцыял», «Інфарматыка і космас» і інш.

Весці такую працу ўніверсітэту дазваляе высокі ўзровень яго навукоўцаў, іх патэнцыял і дасягненні. Штогод у навуковым працэсе ў БДУ ўдзельнічаюць каля 800 навуковых супрацоўнікаў, а таксама больш за 2 тыс. выкладчыкаў. Навуковая праграма БДУ распрацавана на аснове прыярытэтных кірункаў навукова-тэхнічнай дзейнасці і фундаментальных і прыкладных даследаванняў у Рэспубліцы Беларусь на 2011–2015 гады.

***– Якім чынам у БДУ ажыццяўляецца адміністрацыйная падтрымка інавацыйнай дзейнасці?***

– У НДЧ–ГУН створана ўпраўленне навукова-інавацыйнай дзейнасці. У яго задачы ўваходзіць каардынацыя і падтрымка распрацовак на розных этапах інавацыйнага працэсу – гэта рэкламна-выставачная і інфармацыйна-аналітычная дзейнасць, развіццё міжнароднага навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва, патэнтна-ліцэнзійнае суправаджэнне навуковых распрацовак і ацэнка аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці, пытанні ўкаранення і выпуску навукова-тэхнічнай прадукцыі БДУ і інш.

Супрацоўнікі НДЧ–ГУН арганізуюць прасоўванне прадукцыі БДУ на рэспубліканскі і замежныя рынкі. Ва ўніверсітэце былі праведзены кантактна-кааперацыйныя біржы ў галіне сельскай гаспадаркі і інфармацыйных тэхналогій, а таксама арганізаваны ўдзел навукоўцаў БДУ ў кааперацыйных біржах у Беларусі і за мяжой. Для спецыялістаў БДУ ладзіліся семінары і круглыя сталы з прадстаўнікамі міністэрстваў Беларусі і Расіі, МТЗ, РУП «ВА Беларуськалій». Дзякуючы гэтым намаганням заключаны цэлы шэраг дамоў на правядзенне НДВКР і пастаўкі прадукцыі ўніверсітэта яе спажыўцам.

У нашай базе даных зарэгістравана больш чым 300 навукова-тэхнічных распрацовак. Пра іх высокі ўзровень сведчаць шматлікія ўзнагароды і медалі, атрыманыя на міжнародных конкурсах. Новая прадукцыя выпускаецца як па традыцыйных кірунках навукова-інавацыйнай дзейнасці БДУ, так і па нядаўна асвоеных. У прыватнасці, у галіне сельскай гаспадаркі з апошніх распрацовак можна адзначыць біяпрэпараты для абароны і стымулявання раслін: «Немацыд», «Стымул» і «Гулівер», модуль для мікрахвалевай апрацоўкі насення масліных культур, тэхналогію вытворчасці кармавых бялковых канцэнтратаў на аснове другасных прадуктаў вытворчасці біяпаліва з рапсавага алею. У галіне новых матэрыялаў – вогнеўстойлівы поліэфірны нятканы матэрыял і тэхналогія яго атрымання, у галіне экалогіі – новы сарбент для збору нафты і нафтапрадуктаў «Лігнасорб». У БДУ створаны лекавыя прэпараты: супрацьпухлінны прэпарат «Цыспладэл», субстанцыі для атрымання супрацьпухлінных лекавых сродкаў «Праспідыю хларыд» і «Тэмазаламід», сродак для лячэння афтальмалагічных захворванняў «Лакэмокс» і інш. Распрацавана і вырабляецца новае прамысловае абсталяванне – комплекс для вытворчасці сэндвіч-панэляў, абсталяванне для дазацыі, змешвання і заліўкі высакавязкіх кампаўндаў з сістэмай вакуумавання. Высакадакладныя прыборы – вымяральны шматфункцыянальны комплекс новага пакалення В-450, GPS/GSM-трэкер В-602 для маніторынгу перамяшчэння транспарту, шумамер МАНОМ-2М для вымярэння ўзроўню акустычнага шуму ў прамысловых умовах эксплуатацыі і г. д. Ствараюцца новыя сістэмы кіравання дарожным рухам – святлафоры новага пакалення, дарожныя кантролеры і модулі сувязі, новыя комплексы для правядзення франтальных лабараторных работ і эксперыментальных даследаванняў па курсе фізікі.

***– Наш універсітэт з'яўляецца кузняй кадраў для Нацыянальнай акадэміі навук. Як супрацоўнічаем з НАН Беларусі?***

– У межах «Асноўных кірункаў супрацоўніцтва БДУ з навуковымі арганізацыямі НАН Беларусі» вядзецца ў першую чаргу сумесная падрыхтоўка студэнтаў старэйшых курсаў. Напрыклад, існуе дамова аб супрацоўніцтве паміж факультэтам радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій БДУ і Інстытутам фізікі НАН Беларусі, якая прадугледжвае выкананне студэнтамі лабараторных работ. У рамках дамовы аб вучэбна-метадычным і навукова-тэхнічным супрацоўніцтве паміж лабараторыяй оптыкі паўправаднікоў Інстытута фізікі НАН і СНДЛ «Нелінейная дынаміка фізічных сістэм» фізічнага факультэта БДУ праводзяцца сумесныя даследаванні па паўправадніковых лазерах. Для студэнтаў фізфака функцыянуе вучэбна-лабараторны практыкум «Энергафізіка» пры Інстытуце цепла- і масаабмену НАН Беларусі. Студэнты механіка-матэматычнага факультэта неаднаразова праходзілі вытворчую і пераддыпломную практыку ў Аб'яднаным інстытуце машынабудавання і Аб'яднаным інстытуце праблем інфарматыкі. Студэнты хімічнага факультэта маюць магчымасць выконваць курсавыя і дыпломныя работы ў Інстытуце агульнай і неарганічнай хіміі, а таксама ў Інстытуце цепла- і масаабмену імя А. В. Лыкава. Біялагічны факультэт БДУ і Інстытут біяфізікі і клетачнай інжынерыі, эксперыментальнай батанікі, мікрабіялогіі НАН Беларусі, а таксама Цэнтральны батанічны сад дамовіліся разам выкарыстоўваць матэрыяльна-тэхнічную базу для даследаванняў, вучэбнай і вытворчай практык студэнтаў.

У 2004 і 2006 гг. ва ўніверсітэце пачалі функцыянаваць адразу 5 кафедраў двайнога падпарадкавання. Сярод іх кафедра камп'ютарных сістэм апрацоўкі і абароны інфармацыі, кафедра агульнай і неарганічнай хіміі, кафедра клетачнай біялогіі і біяінжынерыі, а таксама кафедра прыкладной оптыкі і кафедра матэматычнага мадэлявання і кіравання.

***– БДУ рыхтуе спецыялістаў па шырокім спектры спецыяльнасцяў. Наколькі нашы выпускнікі гатовыя да навуковай дзейнасці?***

– Навукова-даследчая работа студэнтаў (НДРС) з'яўляецца адным з неад'емных складнікаў вышэйшай адукацыі.

Займаюцца даследчай работай у час пасля вучобы 7 282 студэнты, што складае 38 % ад агульнай колькасці студэнтаў дзённай формы навучання. У выкананні планавых дзяржбюджэтных і гаспадарчадагаворных НДВКР (навукова-даследчых і вопытна-канструктарскіх работах) удзельнічалі 1 327 студэнтаў, у тым ліку 490 на ўмовах аплаты. У 28 СНДЛ (студэнцкіх навукова-даследчых лабараторыях) і іншых творчых аб'яднаннях працаваў 1 761 студэнт. На навуковых канферэнцыях рознага ўзроўню студэнтамі прачытана 5 202 даклады.

Для стымулявання НДРС у БДУ праводзіцца шэраг конкурсаў. Сярод іх конкурс грантаў БДУ. У 2011 г. на 31 праект вылучана 117 млн рублёў. Па выніках конкурсу на найлепшую навуковую працу ўзнагароджваюцца 16 студэнтаў і два найлепшыя навуковыя кіраўнікі. Конкурс на найлепшую СНДЛ прадугледжвае прэміі кіраўнікам і найбольш актыўным студэнтам. Праводзіцца конкурс і на атрыманне матэрыяльнай падтрымкі студэнтамі, якія ўдзельнічаюць у навуковых канферэнцыях. У 2011 г. на гэтыя мэты выдаткавана 7 млн рублёў з уласных сродкаў БДУ.

Студэнты БДУ актыўна ўдзельнічаюць у Рэспубліканскім конкурсе навуковых прац студэнтаў ВНУ. У 2010 г. было ўзнагароджана сярод студэнтаў БДУ 7 лаўрэатаў, 48 аўтараў работ I катэгорыі, а таксама 47 аўтараў работ II і 48 аўтараў работ III катэгорый.

Студэнты БДУ штогод узнагароджваюцца спецыяльным фондам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У 2010 г. былі адзначаны 87 студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ.

Высокая эфектыўнасць сістэмы НДРС універсітэта пацвярджаецца вынікамі паступлення студэнтаў БДУ ў аспірантуру. Выпускнікі БДУ складаюць каля 30 % аспірантаў НАН Беларусі і больш за 20 % аспірантаў іншых ВНУ.

Прызнаннем высокіх дасягненняў нашых супрацоўнікаў у галіне арганізацыі студэнцкай навукі служыць той факт, што на БДУ былі ўскладзены функцыі Рэспубліканскага метадычнага і інфармацыйна-аналітычнага цэнтра НДРС. З удзелам супрацоўнікаў НДЧ-ГУН распрацаваны і ўкаранёны шэраг сайтаў і баз даных, распрацоўваўся ўвесь комплекс метадычных, нарматыўных дакументаў, выконваліся навукова-даследчыя работы, накіраваныя на аптымізацыю дзейнасці Міністэрства адукацыі Беларусі ў дадзенай сферы.

***– З 2008 г. намецілася тэндэнцыя па павышэнні эфектыўнасці аспірантуры. Паказчыкі па абароне дысертацый у тэрмін у БДУ з'яўляюцца самымі высокімі сярод ВНУ сістэмы Міністэрства адукацыі і НАН Беларусі. Як удалося гэтага дабіцца?***

– Вельмі вялікія шанцы для навуковай працы дае конкурс на стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Ва ўніверсітэце таксама існуе цэлая сістэма стымулаў, якая працягвае ўдасканальвацца. Па-першае, для аспірантаў у БДУ існуе прэміяльны фонд. Створана сістэма прэміравання супрацоўнікаў і аспірантаў БДУ за своечасовую абарону дысертацый. Дарэчы, адна з пяці намінацый конкурсу на найлепшага кіраўніка і арганізатара даследчай працы студэнтаў і аспірантаў носіць красамоўную назву «Падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі».

При БДУ дзейнічае 21 савет па абароне дысертацый. Яны забяспечваюць экспертызу дысертацый па 54 навуковых спецыяльнасцях. За перыяд з 2008 па 2010 гг. у саветах пры БДУ па прыродазнаўчым кірунку абаронена 115 дысертацый, з якіх 74 – па фізіка-матэматычных і тэхнічных спецыяльнасцях.

Па гуманітарных навуках было прадстаўлена да абароны 208 дысертацый. Большасць з іх – 62 – адносіцца да гістарычных навук. Філалагічныя навукі таксама ў ліку лідараў – 44 дысертацыі, 31 дысертацыя абаронена па юрыдычных навуках.

Дарэчы, у саветах пры БДУ праходзяць абарону не толькі грамадзяне Беларусі, але і іншых дзяржаў – КНР, В'етнама, Іарданіі, Ірака, Палесціны, Лівіі і Лівана. Найбольш абарон дысертацый замежных грамадзян праходзіла па фізіка-матэматычных і тэхнічных навуках.




*Супрацоўнікі БДУ з узнагародамі Пецярбургскага тэхнічнага кірмашу. Сакавік, 2011 г.*

**Ганна ЛАГУН**

# ПА-ЗА КАНКУРЭНЦЫЯЙ

*Таццяна ГАЕЎСКАЯ, жыццё якой цесна звязана з Навукова-даследчым інстытутам фізіка-хімічных праблем БДУ, дырэктарам якога яна зараз з'яўляецца, а таксама з хімічным факультэтам, які яна заканчвала, мае на сваім рахунку ажно чатыры ганаровыя званні. Сярод іх «Вынаходнік СССР», «Заслужаны работнік БДУ», лаўрэат прэміі імя А. Н. Сеўчанкі і самае апошняе званне – «Мінчанін года». На пытанне, якія з іх ёй найбольш дарагія, Таццяна Васільеўна адказала, што «Заслужаны работнік БДУ» і «Мінчанін года» нагадваюць ёй у першую чаргу пра тое, што родны ўніверсітэт, у які яна патрапіла ў 1963 г., калі паступіла на хімічны факультэт, заўважыў яе стараннi ў працы і навуцы, чым і садзейнічаў яе прызнанню сярод суайчыннікаў і мінчан. Нават сёння яна лічыць важным тое, што НДІ фізіка-хімічных праблем цесна ўзаемадзейнічае з хімічным факультэтам. Гэта надае сілы і ўпэўненасці ў заўтрашнім дні як аднаму, так і другому. Таццяна Гаеўская расказала пра дзейнасць навуковай установы, якой паспяхова кіруе.*



***– Якім чынам узаемадзейнічаюць навуковыя падраздзяленні з кафедрамі хімічнага факультэта БДУ?***

– На плошчах Інстытута арганізаваны і праводзяцца каля 10 практыкумаў і спецпрактыкумаў для студэнтаў хімфака: па рэнтгенаграфіі, электроннай мікраскапіі, каларыметрыі, біяхіміі і іншых. Нашы супрацоўнікі непасрэдна ўдзельнічаюць у навучальным працэсе: чытаюць лекцыі, спецкурсы, праводзяць практыкумы, кіруюць дысертацыйнымі, магістарскімі, дыпломнымі і курсавымі работамі, а таксама навуковай работай студэнтаў малодшых курсаў. Высокі навуковы аўтарытэт, сур'ёзныя адносіны да навучальнага працэсу і студэнтаў – візітоўка нашага НДІ. У нас 19 навуковых падраздзяленняў, у якіх заняты 169 штатных супрацоўнікаў, з якіх адзін акадэмік, 7 дактароў навук і 55 кандыдатаў. Акрамя гэтага, на пастаяннай аснове працуюць і ажыццяўляюць навуковае кіраўніцтва падраздзяленнямі 11 дактароў навук, у тым ліку 2 акадэмікі. Даследчая праца знайшла сваё ўвасабленне ў 59 навуковых выданнях, сярод якіх манаграфіі, зборнікі навуковых прац, матэрыялы канферэнцый, даведачныя выданні. Выпушчана 29 вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў хімічных і іншых спецыяльнасцяў, з іх 9 з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Супрацоўнікамі інстытута надрукавана больш за 5 250 навуковых артыкулаў і 4 700 тэзісаў дакладаў, у тым ліку ў далёкім замежжы – 1 420 і 1 000 адпаведна. Толькі ў мінулым годзе выйшла ў свет 207 артыкулаў і 211 тэзісаў дакладаў.

***– У вашым інстытуце спецыялісты працуюць у розных галінах хіміі. А гэта значыць, што праводзіцца шмат рознабаковых даследаванняў…***

– Інстытут быў створаны на базе навуковых лабараторый хімічнага факультэта БДУ, таму ў нас прысутнічаюць усе віды хіміі – ад неарганічнай да біяхіміі. Мы заўсёды адрозніваліся збалансаваным падыходам да правядзення фундаментальных і прыкладных даследаванняў, а таксама цесным узаемадзеяннем з прадпрыемствамі краіны.

Нашы супрацоўнікі вырашаюць складаныя комплексныя праблемы ў розных галінах хіміі і хімічных тэхналогій.

***– Якія дасягненні ў галіне фундаментальных навук атрыманы апошнім часам навукоўцамі інстытута?***

– У хіміі з'явіліся новыя кірункі, у тым ліку і нанахімія. Гэта хімія малекулярных або атамных кластараў, з іх дапамогай можна атрымаць матэрыялы, якіх раней не існавала. На рахунку навукоўцаў НДІ ФХП – метады сінтэзу нанапамерных часціц металаў, аксідаў і паўправаднікоў, а таксама плёнак. На іх аснове ёсць магчымасць атрымаць кампазіцыйныя матэрыялы з зададзенымі аптычнымі, электрычнымі, магнітнымі і іншымі ўласцівасцямі.

Да перадавых даследаванняў адносяцца разлікі электроннай структуры серыі эндафулеранаў з атамамі розных элементаў – срэбра, медзі, шчолачнымі металамі. Устаноўлены новыя свабоднарадыкальныя механізмы пашкоджвання біялагічна важных малекул. Распрацаваны навуковыя падыходы пошуку фармакалагічна актыўных рэчываў на аснове эфектыўных інгібітараў розных гамалітычных працэсаў. Распрацаваны таксама і новыя падыходы да сінтэзу стэроідаў з выкарыстаннем нетрадыцыйных генна-інжынерных штамаў Yarrowia Lipolytica.

Сярод дзесяці беларускіх навукоўцаў, на працы якіх найбольш часта спасылаліся ў навуковых артыкулах за апошнія 5 гадоў, на першым і сёмым месцы знаходзяцца два нашы супрацоўнікі, што гаворыць пра высокі ўзровень нашых даследаванняў.

Магчымасці хіміі настолькі вялікія, што прырост ведаў і адпаведна новых прадуктаў і рэчываў на іх аснове практычна бясконцы.

***– Якія найбольш удалыя распрацоўкі інстытута знайшлі практычнае ўвасабленне?***

– НДІ ФХП БДУ – аўтар бесперапыннай і перарывістай тэхналогіі атрымання метылавых эфіраў тлустых кіслот з рапсавага алею. На іх аснове на базе ААТ «Гродна Азот» і ААТ «Магілёўхімвалакно» створаны вытворчасці магутнасцю 10 і 20 тысяч тон у год адпаведна. У 2007–2010 гг. адпаведна выпушчана больш за 65 тысяч тон метылавых эфіраў тлустых кіслот, з якіх рэалізавана спажыўцам больш за 1 300 тысяч тон сумесевага дызельнага паліва на суму каля 800 млн долараў. Распрацаваны, зарэгістраваны і ўкаранёныя ў вытворчасць на прадпрыемствах канцэрна «Белбіяфарм» і БДУ новыя лекавыя сродкі, які не маюць аналагаў: «Палікапран», «Лінкаміцыну плёнка», «Ферансэл», «Аксіцэланім», «Працэлан», «Нітраміл», «Лакэмокс», «Нітаргал», супрацьпухлінны прэпарат «Цысплацэл».

Створаны 14 новых сродкаў крыміналістычнай экспертызы. Пры гэтым былі выкарыстаны метады атрымання мікра- і нанапамерных часціц металаў і іх злучэнняў у водна-арганічных сістэмах, якія не змешваюцца. Запатрабавасць краіны ва ўказаных сродках задавальваецца ў поўным аб'ёме. Яны выкарыстоўваюцца спецыялістамі МУС краіны, а таксама экспартуюцца ў Літву, Судан, Расію, Польшчу.

Распрацаваны поліэлектралітны гідрагель «Гісінар», прызначаны для інкрустацыі насення сельскагаспадарчых культур. Ён забяспечвае надзейную фіксацыю пратравы на гэтым насенні, чым і садзейнічае павышэнню ўраджайнасці зерневых на 2–6 ц/га. Штогадовы эканамічны эфект ад яго выкарыстання толькі ў Нясвіжскім раёне склаў 3 млн долараў.

Спецыялісты нашага інстытута навучыліся кіраваць складам электрахімічна асаджаных сплаваў Ni-B і Ni-Co-B за кошт выкарыстання розных дабавак. Гэта дазволіла ўкараніць на прадпрыемствах новыя мадыфікацыі тэхналагічных працэсаў хімічнага і электрахімічнага атрымання функцыянальных пакрыццяў.

У рамках праграмы «Надзвычайныя сітуацыі» на базе аўтаразлівачных станцый АРС-14 выраблена 7 мабільных водаачышчальных установак МАВОУ вытворчасцю 2,5 м³/г. З іх дапамогай можна атрымаць пітную ваду нават з моцна забруджаных крыніц. Для надзвычайных сітуацый распрацаваны саставы для тушэння пажараў, а таксама вогнеўстойлівыя кампазіцыйныя матэрыялы.

Па тэхналогіі інстытута на прадпрыемствах «Навігатар», «Валібел» і «Белсанвет» асвоены прамысловы выпуск серыі дэзінфіцыруючых і мыйных сродкаў пад гандлёвай маркай «Навісан», «Валісан» і «Суперсепт». Яны выкарыстоўваюцца для дэзінфекцыі і дэзінсекцыі прадпрыемстваў мясамалочнай прамысловасці, сельскай гаспадаркі, а таксама транспартных сродкаў.

У мэтах імпартазамяшчэння распрацаваны і выпрабоўваюцца на базе інстытута ўніверсальныя сродкі медыцынскага прызначэння пад гандлёвай маркай «Мультырол», прызначаны для дэзінфекцыі, ачысткі і захоўвання мяккіх кантактных лінзаў. Мы робім усё магчымае, каб гэтыя сродкі экспартаваліся ў Расію і Украіну.

***– Якім чынам інстытут узаемадзейнічае з вытворчымі прадпрыемствамі БДУ?***

– На базе структурных падраздзяленняў, кадравага патэнцыялу і навукова-тэхнічных распрацовак інстытута ў 1999–2001 гг. былі арганізаваны два прадпрыемствы – «Унікаштмет БДУ» і «Уніхімпрам БДУ», якія выпускаюць прадукцыю спецыяльнага прызначэння і імпартазамяняльныя навукаёмістыя хімічныя прадукты. Мы вельмі ганарымся, што сталі ля вытокаў стварэння «Унікаштмета БДУ». Гэта ўнікальнае прадпрыемства ў нашай краіне.

***– Якое месца займае сёння НДІ фізіка-хімічных праблем сярод навуковых устаноў такога тыпу?***

– Адразу хочацца сказаць, што пра канкурэнцыю ў навуцы гаварыць нельга. Калі і ёсць нейкія моманты сутыкнення інтарэсаў паміж навуковымі ўстановамі, то толькі падчас узаемадзеяння і абмену шматлікімі навуковымі ідэямі.

Сёння інстытут лічыцца галаўной арганізацыяй-выканаўцам дзяржаўных навукова-тэхнічных праграм «Фармацэўтычныя субстанцыі і лекавыя сродкі» – падпраграма «Лекавыя сродкі», «Хімічныя тэхналогіі і вытворчасці» – падпраграма «Малатаннажная хімія», «Інавацыйныя біятэхналогіі» – падпраграма «Біяэнергетыка (энергарэсурсы)», дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў «Хімічныя тэхналогіі і матэрыялы» і «Фундаментальная і прыкладная медыцына і фармацыя».

НДІ фізіка-хімічных праблем БДУ – адна з вядучых устаноў хімічнага профілю ў нашай краіне. Пацвярджэннем таму служаць шматлікія ўзнагароды і перамогі ў рэспубліканскіх спаборніцтвах сярод арганізацый навукі і навуковага абслугоўвання. Наш інстытут 5 разоў прызнаваўся найлепшай навуковай арганізацыяй у краіне і ўказамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь быў занесены на Рэспубліканскую дошку гонару. Акрамя гэтага за значны ўклад у арганізацыю і практычную рэалізацыю вынікаў навуковых даследаванняў і падрыхтоўку кадраў вышэйшай кваліфікацыі інстытут адзначаны Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь (2009 г.), Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях (1998 г.). Нашы навуковыя распрацоўкі ў 2004–2011 гг. атрымалі 16 залатых, 12 срэбраных, 8 бронзавых, 1 спецыяльны медалі і 19 дыпломаў на розных міжнародных выставах і салонах. Гэта найлепшы вынік сярод усіх навуковых устаноў нашай краіны.

**Ганна ЛАГУН**



*Міністр адукацыі Беларусі Сяргей Маскевіч, рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка, прарэктар па навуковай рабоце БДУ акадэмік Алег Івашкевіч аглядаюць узоры навукова-тэхнічнай прадукцыі НДІ ФХП*

# Вучымся кіраваць

## Ва ўніверсітэце студэнтам дапамагаюць рэалізаваць сябе шматлікія ўплывовыя моладзевыя арганізацыі

***Якім чынам ажыццяўляецца падтрымка актыўных студэнтаў з боку адміністрацыі, расказвае начальнік упраўлення выхаваўчай работы з моладдзю Павел СКАЛАБАН:***



*УВРМ* дзейнічае па некалькіх напрамках. Па-першае, аддзел моладзевых праграм і праектаў курыруе дзейнасць студэнцкіх арганізацый – Савета старастаў універсітэта, Савета па якасці адукацыі, Моладзевай лігі нацый.

Значнай падтрымкай студэнцкай ініцыятывы стаў конкурс на найлепшы моладзевы праект. Імкненне да самарэалізацыі і ажыццяўлення задумы на практыцы – неабходныя ўмовы ўдзелу ў конкурсе. Калі праект варты, на яго рэалізацыю вылучаюцца істотныя сродкі.

Дарэчы, некаторыя праекты ўжо сталі традыцыйнымі мерапрыемствамі: «Універсітэт – твой крок у будучыню», «Школа старастаў», турысцкі злёт і інш. Таксама папулярным стаў конкурс на найлепшую малатыражную студэнцкую газету, віктарына «Папараць-кветка зацвітае для цябе ў БДУ», віктарына, прысвечаная перамозе ў Вялікай Айчыннай вайне.

З боку адміністрацыі і педкалектыву пільная ўвага надаецца вучобе лідараў моладзевых арганізацый і аб'яднанняў. У межах «Школы студэнцкага актыву» праводзіцца «Зімовая школа студэнцкай журналістыкі», школа актыву БРСМ «Стань найлепшым».

Вельмі важна, каб студэнт асабіста быў зацікаўлены ў навучальна-выхаваўчым працэсе. Многія лідары студэнцкіх арганізацый і органаў студэнцкага самакіравання ўваходзяць у Вучоны савет БДУ. Такім чынам яны ўдзельнічаюць у прыняцці рашэнняў на ўзроўні ўніверсітэта.

Аддзел сацыяльнай работы УВРМ займаецца пытаннямі сацыяльнай падтрымкі. Гэта матэрыяльная дапамога, аздараўленне і санаторна-курортнае лячэнне студэнтаў, праца па падтрымцы дзяцей-сірот, інвалідаў і інш.

Сектар інфармацыйна-ідэалагічнай работы аказвае інфармацыйную, арганізацыйна-метадычную падтрымку структурным падраздзяленням універсітэта па пытаннях ідэалагічнай і выхаваўчай працы, займаецца метадычнай падтрымкай дзейнасці куратараў вучэбных груп.

Удзел у працы моладзевых арганізацый, рэалізацыі праграм і праектаў упраўлення выхаваўчай работы з моладдзю садзейнічае фарміраванню і развіццю лідара, патрыёта, грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.

### Старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ Ніна РАДЗЕВІЧ



*Пярвічная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў БДУ* абараняе сацыяльна-эканамічныя правы і законныя інтарэсы сваіх членаў.

У структуры прафсаюзнай арганізацыі 19 прафсаюзных бюро, 767 прафсаюзных груп, ахоп прафсаюзным сяброўствам складае 91 % навучэнцаў. Прыярытэтнымі напрамкамі работы арганізацыі цяпер з'яўляюцца папулярызацыя ідэй прафсаюзнага руху сярод навучэнскай моладзі, удасканаленне работы па матывацыі прафсаюзнага членства, удасканаленне формаў інфармацыйнай дзейнасці, павышэнне ролі грамадскага кантролю за выкананнем заканадаўства Рэспублікі Беларусь, актывізацыя работы па пытаннях аховы здароўя і стварэнні бяспечных умоў навучання, пашырэнне формаў фізкультурна-аздараўленчых мерапрыемстваў і арганізацыя работы па санаторна-курортным лячэнні.

Пярвічная прафсаюзная арганізацыя праводзіць шмат акцый і мерапрыемстваў: «Віват студэнт! Сапраўдны пацалунак – сапраўднаму студэнту», «Першы тэатр – першай ВНУ РБ», «Прафсаюзы дзецям», «Студэнцтва і прафсаюзы разам», «Здароўе нацыі – у руках маладых» і інш., а таксама навучальныя семінары і бясплатныя юрыдычныя кансультацыі. Арганізаваны групы агульнай фізічнай падрыхтоўкі «Здароўе», аздараўленне навучэнцаў у зімовы і летні перыяд у санаторыях Беларусі і на ўзбярэжжах Чорнага мора, з 2007 г. праходзіць конкурс на найлепшую пастаноўку работы па арганізацыі ўваходжання студэнтаў 1 курса ў члены прафсаюза, аказваецца матэрыяльная дапамога сябрам прафсаюза і навучэнцам розных сацыяльных катэгорый.

***Пра студэнцкае самакіраванне ў студгарадку распавядае яго дырэктар Міхаіл ЧАРАПЕННІКАЎ:***



Важнай асаблівасцю цэласнага выхавання з'яўляецца аператыўнае кіраўніцтва студэнцкім калектывам, актывізацыя сацыяльнай дзейнасці студэнтаў. Для рэалізацыі гэтых задач у *Студэнцкім гарадку БДУ* фарміруюцца органы студэнцкага самакіравання.

У інтэрнатах дзейнічаюць студэнцкі савет, аператыўны атрад, старасты паверхаў, блокаў, пакояў. На ўзроўні студгарадка функцыянуюць Каардынацыйны савет студэнцкіх саветаў інтэрнатаў БДУ, Савет па прафілактыцы парушэнняў правілаў пражывання ў інтэрнатах, Студэнцкая служба бяспекі, Студэнцкая творчая лабараторыя, Грамадская інфармацыйная служба, Студэнцкі спартыўна-турысцкі клуб.

Асаблівая ўвага надаецца падбору, навучанню і забеспячэнню пераемнасці лідараў, бо іх дзейнасць абмежавана тэрмінам навучання. Для гэтага на працягу навучальнага года дзейнічае Школа студэнцкага актыву.

Праз органы студэнцкага самакіравання студэнты атрымліваюць магчымасць супрацоўнічаць з падраздзяленнямі і грамадскімі арганізацыямі БДУ, удзельнічаць у ажыццяўленні моладзевых праграм універсітэта, у рэалізацыі дзяржаўнай моладзевай палітыкі.

### Сакратар грамадскага аб'яднання БРСМ БДУ Сяргей КЛІШЭВІЧ



*БРСМ* – месца, дзе вас сапраўды чакаюць і шануюць. Мы заўсёды рады новым людзям і ідэям. БРСМ БДУ прапануе трынаццаць кірункаў.

Перш за ўсё гэта арганізацыя другаснай занятасці моладзі (кадравае агенцтва). Калі ў студэнта ёсць вольны час, сілы і жаданне папрацаваць, то наш Штаб працоўных спраў пастараецца прапанаваць ім самыя лепшыя ўмовы. Для гэтага праводзяцца кірмашы вакансій, фарміруюцца студэнцкія атрады. Да прыкладу, сёлета больш за 1000 юнакоў і дзяўчат працавалі ў будаўнічых, сельскагаспадарчых, валанцёрскіх і сэрвісных атрадах.

Вядзецца праца па такіх напрамках: моладзевы атрад аховы правапарадку, праца са спонсарамі (фандрайзінг), PR і праца са СМІ, моладзевы палітычны клуб, праца з клубамі сталіцы і прамоўтарская дзейнасць (клубны напрамак), арганізацыя адпачынку і забаў (карпаратыўны напрамак), спорт, міжрэгіянальнае супрацоўніцтва, рэжысура і пастаноўка мерапрыемстваў і інш.

Акрамя гэтага, БРСМ БДУ прапануе паўдзельнічаць у цікавых праектах: «Стань найлепшым!» (конкурс на найлепшую пярвічку ГА «БРСМ» сярод факультэтаў); студэнцкі турысцкі злёт БДУ; «Універсітэт – твой крок у будучыню» (асветніцкая акцыя для старшакласнікаў). Прыходзь да нас! Будзь побач з намі! Расфарбуй сваё жыццё ў колеры БРСМ!

### Старшыня студэнцкага саюза БДУ Настасся ГВАРДЗІЯН



*Студэнцкі саюз БДУ* – гэта каманда маладых, крэатыўных людзей, аб'яднаных жаданнем рабіць жыццё ва ўніверсітэце яркім, напоўненым сэнсам і падзеямі. Усе мы бязмерна любім alma mater і імкнёмся захоўваць традыцыі студэнцтва, развіваць, прыўносіць у іх новае дыханне, а часам і ствараць новыя. Так, ужо стала добрай традыцыяй праводзіць «капуснік» сярод студэнтаў-першакурснікаў. У арганізацыі падтрымліваецца пераемнасць пакаленняў, у нашых справах бяруць удзел выпускнікі. Мы, маленькая сям'я ў вялікім доме БДУ, робім так, каб кожны адчуваў сябе яе часткай. Таму дзень нараджэння ўніверсітэта кожны год для нас важная «сямейная» падзея, як і дні нараджэння ўсіх факультэтаў. За 14 гадоў існавання наша арганізацыя стала адной з перадавых у ВНУ і да гэтага часу з'яўляецца адзіным студсаюзам у краіне.

Студэнцкі саюз пастаянна падтрымлівае і развівае супрацоўніцтва з ВНУ краін СНД, годна прадстаўляе наш універсітэт на міжнародных мерапрыемствах, пры гэтым арганізоўвае семінары, круглыя сталы і канферэнцыі міжнароднай накіраванасці ў нашым універсітэце.

P. S. Жыццё было б змрочным, калі б не было сонца. Зробім яго ярчэйшым разам!

### Старшыня Савета старастаў БДУ Алег БУКАТЫЧ



*«Неяк мая аднагрупніца жартам назвала мяне, старасту, запісной кніжкай. Маўляў, апошнія навіны і напаміны заўсёды можна даведацца ў мяне. Я задумалася: а так жа і ёсць, менавіта староста – запісная кніжка групы».*

Старшыня савета старастаў Інстытута журналістыкі **Святлана Ісаёнак**

Усяго старастаў у БДУ налічваецца каля 900 чалавек. Іх заўсёды лёгка пазнаць па адметных рысах – журнал у руцэ і ўпэўненасць у вачах. Яны без трапятання ўваходзяць у дэканат або кабінет дэкана. Адна з асноўных задач старасты – інфармаваць групу пра змены ў навучальным працэсе.

Вышэйшы орган арганізацыі – *Савет старастаў БДУ*. Галоўнымі задачамі яго з'яўляюцца аптымізацыя вучэбна-выхаваўчага працэсу ва ўніверсітэце, фарміраванне ўмоў для выяўлення і развіцця паспяховай вучэбнай, даследчай, творчай і грамадскай актыўнасці студэнтаў.

Візітнай карткай Савета старастаў з'яўляецца яго эмблема – выява пацешнага мудраца «Дзеда-барадзеда». І гэта нездарма, бо староста павінен быць мудрым і разважлівым чалавекам.

### Старшыня Студэнцкага савета па якасці адукацыі БДУ Дар'я ВОЛКАВА



*Студэнцкі савет па якасці адукацыі (ССЯК)* – маладая студэнцкая арганізацыя, якая дынамічна развіваецца. З моманту заснавання ў 2003 г. савет паставіў сабе мэтай выяўленне і аналіз праблем, якія існуюць у сферы факультэцкай і ўніверсітэцкай адукацыі, а таксама распрацоўку прапаноў па іх вырашэнні. Характэрнай рысай арганізацыі з'яўляецца тое, што яго сябры здольныя назіраць сітуацыю знутры, таму што ўсе заганы, якія існуюць у нашай сістэме адукацыі, яны адчуваюць непасрэдна на сабе і, такім чынам, могуць выявіць корань праблемы і паказаць на яго супрацоўнікам універсітэта.

Дзейнасць савета ахоплівае ўсе сферы адукацыйнага працэсу: непасрэдна сам вучэбны працэс (вучэбную нагрузку, расклад заняткаў, узаемаадносіны выкладчыкаў і студэнтаў, праблему недахопу вучэбнай літаратуры), пазавучэбную і навуковую дзейнасць.

У канферэнцыях, круглых сталах, якія праводзяцца ССЯК, прымаюць удзел паважныя выкладчыкі і члены адміністрацыі ўніверсітэта.

Мы вітаем прагрэсіўныя, адпаведныя часу праекты і прапановы, якія садзейнічаюць самавыяўленню студэнтаў. ССЯК – арганізацыя, дзе крэатыўнасць гарманічна спалучаецца з дзелавымі зносінамі.

# УНІВЕРСІТЭТ І СПОРТ



Фота РЫФТУР

Каманда БДУ – пераможца Беларускай лыжні-2011

***Ва ўніверсітэце рыхтуюць спецыялістаў вельмі шырокага профілю. Але незалежна ад таго, кім вы будзеце па прафесіі, самым працяглым для вас будзе курс па фізвыхаванні, а не па профільных прадметах. Чаму? Пра гэта нам расказа загадчык кафедры фізвыхавання і спорту БДУ Віктар КАЛЯДА.***



***– Віктар Антонавіч, нашаму ўніверсітэту спаўняецца 90 год. Даволі сур'ёзны ўзрост. А як усталёўвалася фізічнае выхаванне ў альма-матар?***

– З самага пачатку заснавання нашага ўніверсітэта фізічнай падрыхтоўцы надавалася ўвага. Перавагу мелі індывідуальныя і сілавыя віды спорту, і гэта не дзіўна, бо асноўнай задачай «фізвыхавання» таго часу была падрыхтоўка ваенных кадраў, што адпавядала дзяржаўна-савецкай палітыцы. Але кафедра фізвыхавання была заснаваная толькі пасля вайны, 1 верасня 1948 г., у складзе пяці чалавек на чале з малодшым лейтэнантам Міхаілам Шэйнэманам.

***– БДУ быў заснаваны ў СССР, але ўжо дваццаць гадоў існуе як дзяржаўны ўніверсітэт незалежнай Беларусі. Якія савецкія традыцыі захаваліся, а што ўсё ж такі засталося ў гісторыі?***

– Першая ўніверсітэцкая спартакіяда была праведзена ў 1953 г. па сямі відах спорту. На сёння Рэспубліканская ўніверсіяда налічвае 35 відаў, у 34 з якіх мы ўдзельнічаем. Праўда, не ўсе віды, што былі ў пяцьдзясят трэцім, захаваліся, напрыклад, гімнастыка.

Зараз фізкультурай займаюцца два разы на дзве гадзіны на тыдзень, і ў СССР была норма ў 4 гадзінныя заняткі.

Цікава, што заканадаўча фізвыхаванне афармілася толькі ў незалежнай Беларусі дзякуючы закону 1993 г., які быў дапоўнены ў 2003: «Закон Рэспублікі Беларусь пра фізічную культуру і спорт». У СССР такой заканадаўчай базы не было.

***– А калі параўноўваць увесь працэс навучання, матэрыяльную базу ў БДУ і іншых ВНУ Беларусі: якія ёсць агульныя рысы, а ў чым розніца?***

– Калі мы спрабуем параўнаць, варта памятаць пра спецыфіку кожнага асобнага ўніверсітэта. БДУФК (Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры) рыхтуе будучых спартоўцаў – таму ў іх магчымасці большыя. Калі мы гаворым пра МДЛУ, там пераважаюць дзяўчаты і прыярытэты маюць гульнявыя віды, такія, напрыклад, як валейбол, і цыклічныя: плаванне, лыжы.

БДУ, у сваю чаргу, самы масавы ўніверсітэт. У ім навучаюцца студэнты як гуманітарнага, так і прыродазнаўчага кірункаў. Папершае, стаўка робіцца на індывідуальныя віды. Па-другое, на багатых традыцыі: калі мы заўжды славіліся лёгкаатлетамі, барцамі, лыжнікамі, шахматыстамі, то і надалей будзем трымаць марку. Шкада толькі, што згубілі стралкоў ды матацыклістаў. А па-трэцяе, акцэнты расстаўляюцца па ініцыятыве саміх студэнтаў: каратэ, паўэрліфтынг (сілавое трохбор'е), гіравы спорт, аэробіка, таэквандо, дзюдо. Футбола ажно цэлых пяць відаў, і набывае папулярнасць шосты, пляжны, да якога мы пакуль не дайшлі, але ўсё магчыма.

***– А хто з пераможцаў алімпіяд і сусветных універсіяд можа сказаць: я выпускнік БДУ?***

– Першы алімпійскі медаль, сярэбраны, у 1960 г. з Рыма для БДУ прынёс Валодзя Гараеў у трайным прыжку, а першае золата – з Сеула (1988) па грэка-рымскай барацьбе студэнт юрфака Камандар Маджыдаў. У Пекіне (2008) бралі ўдзел 5 чалавек, сярод якіх Макс Мірны і бронзавыя прызёры Міша Сямёнаў (грэка-рымская барацьба) і Надзея Астапчук (штурханне ядра).

Калі гаварыць пра сусветную ўніверсіяду, самага вялікага поспеху дасягнулі ў 2007 г. у Турыне Лена Саннікава з Вольгай Васілёнак – золата лыжнай эстафеты.

***– Сапраўды, ёсць чым ганарыцца. Нездарма фізвыхаванне – самы доўгі курс ва ўніверсітэце…***

– Усё ж такі ніводзін іншы прадмет, якім бы неабходным ён ні быў у будучай прафесіі, не адказвае за стан здароўя, а тым больш не спрабуе яго палепшыць.

Да таго, калі ёсць магчымасць пабегаць, паплаваць, пакатацца на роварах ці ў лядовых палацах на коўзанках, пагуляць у футбол, баскетбол, калі ты студэнт, і гэта ўсё бясплатна, няўжо нехта адмовіцца?! Калі ствараюцца спрыяльныя ўмовы, то і жаданне быць у тонусе ў студэнтаў абавязкова з'яўляецца.

***– А давайце трошку пафантазіруем. Святочны стол, шмат гасцей, а на чале наш імяніннік. Ваша чарга гаварыць тост. Што б вы пазычылі нашаму юбіляру?***

– Вялікага шчасця. Шчасця як для яго, так і для кожнага, хто з ім будзе сутыкацца. А ўсім тым, хто мае самае непасрэднае дачыненне да ўніверсітэта, я б пазычыў: любіце студэнтаў, каб пасля яны любілі вас.

**Алесь НОВІКАЎ**

# Традыцыі. Пошук. Эксперымент

***Упраўленне па справах культуры БДУ – своеасаблівы цэнтр, які каардынуе культурнае жыццё ўніверсітэта, дзе кожны можа знайсці прымяненне сваёй творчай энергіі і таленту. Супрацоўнікі ўпраўлення штогод арганізуюць для студэнтаў мноства разнастайных мерапрыемстваў. Культурнае жыццё ва ўніверсітэце вірue: у БДУ дзейнічае мноства калектываў, якія штогод радуюць нас сваімі дасягненнямі. Напрыклад, у красавіку 2011 г. быў удастоены звання «Заслужаны аматарскі калектыў Беларусі» ансамбль танца «Крыжачок».***

***Пра працу ўпраўлення па справах культуры БДУ падрабязна распавяла Кацярына САЛАДУХА, намеснік начальніка ўпраўлення.***



– На працягу года праходзіць шмат мерапрыемстваў, і ўсе яны досыць разнапланавыя. Адна частка – масавыя, другая – мерапрыемствы, звязаныя з мастацтвам. Што тычыцца масавых мерапрыемстваў, то яны часцей за ўсё прысвечаны пэўным датам. Найбуйнейшым з іх з'яўляецца мерапрыемства «Віват студэнт!», якое штогод праводзіцца 1 верасня. Гэта прысвячэнне першакурснікаў у студэнты, якое праходзіць у Палацы спорту і збірае каля шасці тысяч гасцей.

Другі буйны праект – Дзень нараджэння ўніверсітэта. Сёлета, у сувязі з юбілеем БДУ, будзе арганізавана цэлая серыя мерапрыемстваў, прысвечаных гэтаму святу.

«Міс БДУ» праводзіцца раз у два гады. Гэта вельмі прыгожая падзея, якая праходзіць вясной ва ўніверсітэцкім дворыку.

«Фестываль эстрады» – вельмі папулярнае мерапрыемства ў студэнтаў. Яны пачынаюць пытацца пра яго ледзь не з моманту паступлення. З «Фестывалем эстрады» звязаны такі праект, як «Студэнцкая філармонія». Удзельніцай яе калісьці была Карыяна. Дзіма Калдун у нас удзельнічаў. І Георгій Калдун таксама. Усе зоркі, якія з'яўляюцца выпускнікамі БДУ, прымалі ўдзел ва ўсіх нашых творчых конкурсах і фестывалях.

Таксама ёсць рок-фестываль «Такія пернікі». Ён праходзіць у канцы лістапада. Рок-музыка заўсёды папулярная ў студэнцкім асяроддзі. Існуе шмат студэнцкіх рок-гуртоў, якія хочуць паказаць свае сілы і актыўна выступаюць на фестывалі. Многія з удзельнікаў рок-фестывалю сёння ўжо досыць вядомыя, напрыклад, гурт «Лайтсаўнд».

КВЗ, безумоўна, шалёна папулярны праект. Адкрытая ліга КВЗ БДУ звычайна пачынаецца ў лютым з фестывалю КВЗ, які збірае каля 40 каманд з усёй краіны. У КВЗ у нас таксама ёсць свае зоркі: каманда КВЗ БДУ двойчы станавілася чэмпіёнам Вышэйшай лігі.

***– Ці ёсць сярод мерапрыемстваў, якія арганізуюцца ўпраўленнем па справах культуры, міжнародныя?***

– Калі казаць пра міжнародныя мерапрыемствы, то гэта перш за ўсё два буйнамаштабныя праекты – «Папараць-кветка», міжнародны форум студэнцкіх хароў, і «Тэатральны куфар», міжнародны фестываль студэнцкіх тэатраў.

***– Якімі прынцыпамі кіруецца ў сваёй працы ўпраўленне па справах культуры?***

– Мы працуем як каманда і любое мерапрыемства робім разам. Вядома ж, кожны каардынуе свой праект. Па-іншаму быць не можа: хтосьці павінен стаяць на чале мерапрыемства. У нас заўсёды існуе дакладнае размеркаванне абавязкаў, і кожны ведае сваю задачу. Мы вельмі любім выказванне нашага паважанага начальніка Уладзіміра Макарэвіча: «Калі вам цікава самім, то будзе цікава і людзям». У нашай дзейнасці мы абапіраемся на крэатыўнасць і творчасць. Дэвіз «Тэатральнага куфра» – «Традыцыі. Пошук. Эксперымент» – выкарыстоўваецца ў дачыненні да ўсіх нашых мерапрыемстваў і падыходзіць да нашай працы ў цэлым.

**Таццяна БАБУШКІНА**



Фота Дзмітрыя ГАЛОШКІ

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

24 кастрычніка 2011 года
Падпісана да друку 20.10.2011 г.
Зак. 652. Тыраж 2000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/0494178 ад 03.04.2009.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by